ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дарновым даставкаю „Прафрух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвесткі—1 р. за радок. Паскрэд тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—зьніжка. Зьвыш тэрміну, згодна пастановы СНК ад 10-IX-24 г. бярэцца 10 проц. адгаку.

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ПАНЯДЗЕЛАК, 17 сакавіка 1930 г.
№ 64 (3572)
Год выданьня — XIV.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інформацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная ка тора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Баявыя задачы пасеўнай кампаніі

Надрукаваная ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» зводка Наркамзему БССР аб ходзе падрыхтоўкі да сяўбы прымушае нас біць трывогу. Ня гледзячы на вельмі кароткі тэрмін, што застаўся да сяўбы, нашы мясцовыя арганізацыі не пераключыліся яшчэ на непасрэдную падрыхтоўку да палявых работ. Няма таго баявога тэмпу, няма тэй упартай падрыхтоўчай работы, якая так неабходна ў цяперашні вдказьнейшы этап пасеўнай кампаніі.

Зводка Наркамзему падкрэсьлівае, што на паасобных вучастках пасеўнага фронту, ад перамогі на якіх залежыць у значнай ступені выніх пасеўнай кампаніі, мы маем ня толькі нязначнае прасоўваньне ўперад, але нават таптаньне на адным і тым-жа месцы. Зводка пацьвярджае, што рад важнейшых заданьняў партыі і ўраду зусім выпаў з-пад увагі зямельных органаў.

«Зьвязда» ня раз паказвала на недапушчальна слабы тэмп АБАГУЛЬНЕНЬНЯ РАБОЧАЕ ЖЫВЁЛЫ. Апошняя дзесяціднёўка не дала ніякіх паляпшэньняў на гэтым найбольш слабым для нас вучастку пасеўнага фронту. На 10 сакавіка абагулена 38.7 проц. супроць 36.6 проц. на 10 лютага. Такім чынам, за месяц ёсьць павялічэньне толькі на 2 проц. Такім чынам, цэлы месяц перад самай сяўбой страчаны без карысьці.

Гэтыя прарывы ў справе абагульненьня рабочае скаціны нічым іншым вытлумачыць нельга, як тым, што ў радзе месц нашы работнікі забылі аб галоўным, аб асноўным. Замест непасрэднай, энэргічнай работы над абагульненьнем асноўных сродкаў вытворчасьці, многа сіл, увагі аддавалі дробнай і непрадукцыйнай скаціне. Сьвіньня, авечка, кароўка аднакароўнікаў закрылі сабою для некаторых гораканстрыбізатараў каня, інвэнтар, насеньне і кармы. Шмат часу патрацілі на абмеркаваньне «мэтазгоднасьці» (!) яснай і не дапускаўшай ніякіх тлумачэньняў дырэктывы партыі аб новым статуце замест таго, каб яго неадкладна ўвесьці ў моц, і мала, злачынна мала, зрабілі для стварэньня цягавай сілы ў калгасах.

Ня пепш, чым з абагульненьнем рабочае і тавара-прадукцыйнае скаціны, стаіць справа з КАРМАМІ. Мы ўжо адзначалі, што ва многіх мясцох адарвалі абагульненьне скаціны ад абагульненьня кармоў. Кармовае пытаньне выпала з-пад увагі мясцовых работнікаў. Весткі з месц, якія паступілі ў апошнія дні, гавораць аб пагоршаньні становішча. Мы зьвярнем увагу нашых чытачоў на тэлеграму з Гомелю, надрукаваную ва ўчарайшым нумары «Зьвязды». Карэспандэнт паведамляе, што ў акрузе стварыпася пагражаючае становішча з кармамі. Амаль зусім няма абагуленых кармоў ва Ўваравіцім, Рэчыцкім і Цэрахаўскім раёнах. Райкалгассаюзы ня ўжылі ніякіх мер да забесьпячэньня калгасаў кармамі. Калгасы задыхаюцца ад адсутнасьці кармовых рэзэрваў, а мясцовыя работнікі нічога не зрабілі для мабілізацыі сродкаў калгаснай сыстэмы для куплі кармоў, нічога не зрабілі для ўзмацненьня абагульненьня кармоў.

Некалькі слоў аб стварэньні НАСЕННЫХ ФОНДАЎ. На 10 сакавіка засыпана 84 проц. патрэбнае колькасьці насеньня збожжавых культур. Ссыпка насеньня павінна была быць поўнасьцю скончана яшчэ да 20 лютага. Мінула больш за 20 дзён. Заданьне ўраду да гэтага часу ня выканана. Апошняя дзесяціднёўка не дала ніякіх станоўчых вынікаў.

Яшчэ большыя зрывы мы маем з ссыпкай насеньня ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР І ТРАЎ. Па тэхнічных культурах выканана толькі 32,3 проц., а па лубіне нават яшчэ менш—20 проц. заданьня.

На гэты пагражаючы вучастак пасеўнай кампаніі неабходна зьвярнуць самую сур'ёзную увагу. Калгасы ўсё яшчэ не забясьпечаны насеньнем! Гэта павінны памятаць усе нашы партыйныя і савецкія арганізацыі. Ніякім дэмабілізацыйным настроям тут ня месца. Насеньне як збожжавых, так і тэхнічных культур павінна быць ссыпана поўнасьцю. Ні аднаго дня не прамарудзіць, ні аднэй нескарыстанай гадзіны! Час не чакае.

АЧЫСТКА НАСЕНЬНЯ — гэтае прасьцейшае агрыкультурнае мерапрыемства — таксама яшчэ не праведзена поўнасьцю. Ачышчана толькі 73 проц. пляну. І тут прапушчаны ўсе тэрміны, становішча яўна ненармальнае.

МАШЫНА-КОННЫЯ станцыі таксама не арганізаваны. З 370 прадугледжаных плянам, прыступлена да стварэньня 188. Аднак, і частка гэтых станцый існуе толькі на паперы. Нашы брыгадзіры паведамляюць, што ў радзе месц, абагульваючы скаціну і інвэнтар, думаюць, што гэтым самым ужо арганізаваны станцыі. Недаацэнка значэньня машына-конных станцый, гэтай пепшай формы арганізацыі інвэнтару і цягавай сілы ў калгасах, яшчэ ня зжыта. Многія раёны адмаўляюцца ад стварэньня станцый. «Нам машына-конныя станцыі не патрэбны», — часта заяўляюць раённыя работнікі ў адказ на запытаньне аб прычынах іх марудносьці ў вырашэньні гэтага важнага пытаньня.

Трэба асобна падрабязна спыніцца на нашых БЕЛАРУСКІХ САЎГАСАХ. Нядаўна калегія Наркамзему канстатавала правал на гэтым вучастку работы. Аказваецца, што Белсельтрэсту, непасрэднаму кіраўніку саўгасаў, нічога не вядома, як ідзе падрыхтоўка да весенняй кампаніі. Ачыстка насеньня, рамонт інвэнтару далёка ня скончаны. З 60 трактараў, якія ёсьць у саўгасах, адрамантавана толькі 40-50 проц. Толькі гэтымі днямі былі заключаны дагаворы з чыгуначнымі майстэрнямі на рамонт інвэнтару. Дырэктыва аб пашырэньні саўгасаў не праведзена ў жыцьцё. Белсельтрэст нават ня ведае разьмераў вызначанай пад узбуйненьня саўгасы тэрыторыі. Сацыялістычнае спаборніцтва паміж рабочымі не разгорнута. Рабочыя ня ўдзельнічаюць у абмеркаваньні вытворчых пляноў саўгасаў.

Калегія Наркамзему абвясьціла вымову Мірэцкай Белсельтрэсту. Але гэтага мала. Белсельтрэстаўскія прарывы павінны быць зараз-жа ліквідаваны. А дзеля гэтага трэба перайсьці на зусім іншыя тэмпы работы, узьняць масы саўгасаўскіх рабочых, прыцягнуць іх да актыўнейшага ўдзелу ў будаўніцтве саўгасаў.

Толькі нядаўна была праведзена мабілізацыя 90 проц. спэцыялістых. Значная частка іх ужо знаходзіцца ў раёнах. Аднак, з месц паступаюць трывожныя весткі. АГРАНОМЫ ЗАТРЫМЛІВАЮЦЦА Ў РАЁННЫХ ЦЭНТРАХ. Замест непасрэднай работы ў калгасах, замест складаньня рабочых пляноў на месцы з улікам мясцовай абстаноўкі і ўмоў, замест усяго гэтага РАБОЧЫЯ ПЛЯНЫ ЧАСТА складаюцца агрономамі ў габінэтах раённых цэнтраў. Калгасы скардзяцца на няпрыгоднасьць такіх пляноў, на іх няжыцьцёвасьць. Такому злачынному выкарыстаньню сіл спэцыялістых у момант, калі пераважная частка калектыўных гаспадарак не арганізавала вытворчасьці і працы, калі многія калгасныя работнікі ня ведаюць, як падыйсьці да вырашэньня гэтай найцяжэйшай праблемы, трэба зараз-жа пакласьці канец. Арганізацыя працы і вытворчасьці ў калгасах—адна з адказнейшых чэрговых задач. Без пасьпяховага ня вырашэньня немагчыма замацаваньне дасягнутага на фронце сацыялістычнай перабудовы вёскі, немагчыма далейшае прасоўваньне ўперад.

Нарэшце, трэба асобна падкрэсьліць вялізнае значэньне падрыхтоўкі да сяўбы індывідуальнага сэктару сельскае гаспадаркі. 30 прац. плошчы БССР яшчэ занята індывідуальнымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі. Партыя давала зусім ясныя і катэгарычныя указаньні аб важнасьці ўзмацненьня падрыхтоўчай работы да сяўбы ў індывідуальных гаспадарках. Бурны тэмп калектывізацыі БССР, стварэньне цэлых округ і раёнаў суцэльнай калектывізацыі зусім ня зьнімаюць з парадку дня барацьбы за павышэньне ўрадлівасьці і пашырэньне плошчаў у індывідуальным сэктары сельскае гаспадаркі. Побач з узмоцненай падрыхтоўкай калгасаў, побач з іх арганізацыйным умацаваньнем, побач з упартай работай па далейшым пераводзе дробных індывідуальных гаспадарак у буйныя абагуленьня—побач з усім гэтым чэрга ні на мінуту выпускаць з-пад увагі важнасьць павышэньня прадукцыйнасьці індывідуальных сельскіх гаспадарак. Гэта ўстаноўка, зразумела, ня мае нічога агульнага з установкай правых апартуністых на разьвіцьцё толькі аднаго індывідуальнага сэктару ў процівагу калектыўнаму. Узмацняючы работу на калектыўным сэктары, сюды пераносячы цэнтр цяжару, не забываць аб індывідуальным сэктары—такая лічыць партыі. І з усёй рашучасьцю, з усёй сілай трэба біць па тых, хто лічыць работу сярод індывідуальных гаспадарак непатрэбнай, хто заяўляе, што ня справа, моў, партыі і савецкай улады клапаціцца аб пасеўнай плошчы індывідуальных гаспадарак.

Такія заявы толькі на руку кулаку, бо проста зацікаўлены ў зрыве сяўбы ў індывідуальных гаспадарках, які вядзе зараз узмоцненую агітацыю за зьмяншэньне пасеўных плошчаў.

Падрыхтоўчая работа да вялікай пасеўнай кампаніі гэтага году ідзе ўсё яшчэ нездавальняюча. Аб гэтым сьведчыць апошняя зводка Наркамзему. Тэмпы невыстарчальныя. Сьпячка, абломаўшчына, марудносьць усё яшчэ ня зжыты, усё яшчэ пануюць ва многіх нашых установах.

І ўсё гэта ў момант, калі до сяўбы застаўся пітарэльна лічаны дні, калі кулацтва ўсімі сіламі прабуе разбурыць калгасы з сярэдзіны, калі яно, скарыстоўваючы памылкі, перагібы паасобных галавацяпаў і злачынцаў, прабуе дыскрэдытаваць калгасны рух.

Партыя вядзе і будзе весьці бязьлітасную барацьбу з тымі, хто адміністраваньнем і перагібамі тармозіць умацаваньне і рост абагуленага сэктару сельскае гаспадаркі. Партыя дасьць рашучы адпор прымірэнчым адносінам да кулака. Партыя адкрые агонь па ўсіх, хто праяўляе бязьдзейнасьць, марудносьць у адказнейшыя дні перад пачаткам палявых работ.

Ссыпка і загатоўка насеньня тэхнічных культур і траў --слабое месца падрыхтоўкі да сяўбы

Узмоцнім абагуленьне кармоў у калгасах; прывядзем у баявую гатоўнасьць саўгасы

КЕБЯСЬПЕЧНЫ ВУЧАСТАК

БССР зьяўляецца ільнаводным раёнам. Па пасеўнай плошчы ільну яна займае 8-9 проц. усяе плошчы ільну па СССР, а па ільне - даўгунцы — 11 проц.

Пасеўны плян па Беларусі прадугледжвае ў гэтым годзе засеў пад лён плошчы ў 18.400 гэкт. (павялічэньне супроць мінулага году на 20 проц.). Але на мясцох сярод некаторых зямельных працаўнікоў і калгасьнікаў пашырана прадузятая думка, што разьвіцьцё тэхнічных культур — гэта справа дробных сялянскіх гаспадарак, а ня буйных калектыўных гаспадарак. Выходзячы з такое няправільнае думкі некаторыя калгасы праяўляюць тэндэнцыю пашыраць плошчу збожжавых культур за кошт тэхнічных.

Зводка (апублікаваная ва ўчарайшым нумары «Зьвязды») гаворыць, што ссыпка абагуленых фондаў у калгасах ільна - насеньнем забясьпечвае толькі 1/3 патрэбы. Такі процант ссыпкі зьяўляецца надзвычай мізэрным і выклікае трывогу. Між тым, у мінулым годзе мы мелі ў Беларусі добры ўраджай ільну і насеньне ёсьць у сялян у выстарчальнай колькасьці. Работнікі на мясцох надавалі значэньне толькі абагуленьню збожжавых культур і нядбала адносіліся да збору насеньня тэхнічных культур. На мясцох часта прыходзілася чуць такую думку: «з тэхнічнымі культурамі можна пачакаць — гэтае насеньне пікуты не ўпячэ, жывёлы ім ня скормім, на млынох не разьмелеш». Такія тэндэнцыі паслаблялі ўвагу да збору ільна - насеньня.

Яшчэ горшае становішча мы маем з забесьпячэньнем насеньнем траў. Тая самая зводка гаворыць, што абагуленыя насенныя фонды ў калгасах забясьпечаны насеньнем траў на 46 проц., а насеньнем лубіну ўсяго толькі на 20 проц. І тут мы сустракаемся з няправільным падыходам мясцовых работнікаў: «галоўнае, моў, гэта збожжавыя культуры, а травы што!?».

Вось малюнак загатовак насеньня траў на 1-га сакавіка. Па канюшыне загатоўкі на Палядоўдсаюзе выканаць на 48 проц., па Белкаапсаюзу—на 31 проц. Па цімафееўцы загатоўка па лініі Палядоўдсаюзу выканана ўсяго на 22 проц. І яшчэ менш па лініі БКС — на 13 проц. Агульная забясьпечанасьць разам з завозам — 40 проц. Крыху лепшае становішча мы маем з вікай — тут Палядоўдсаюз паказвае 68 проц. пляну і БКС—44 проц. (забясьпечанай разам з завозам 61 проц.).

Зусім дрэннае становішча з сераделяй —тут аднолькава кепская загатоўка па абодвых лініях — Палядоўдсаюзу і БКС (20-22 проц.), а загатоўка лубіну толькі ледзь-ледзь падняслася над узроўнем нуля — 2-3 проц.

Трэба прыналегчы на загатоўку і збор насеньня траў і, у першую чаргу, лубіну. Ва многіх гаспадарках лубін яшчэ не абмалочаны. Абмалот трэба паскорыць. Трэба таксама высьветліць становішча з забясьпячэньнем гэтымі культурамі індывідуальнага сэктару, які пакуль яшчэ захоўвае даволі значную ўдзельную вагу ў нашай сельская гаспадарцы.

Л. Н—даў.

ПОУНАЯ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ

ЯК «КІРУЕ» БЕЛСЕЛЬТРЭСТ

Саўгас «Станіслава» ў Дубровенскім раёне яшчэ далёка не падрыхтаваны да веснавой сяўбы. Мінэральнага ўгнаеньня не завезена ні фунта. Невялома, колькі сабрана попелу па саўгасе. Не хапае пягавай сілы — 12 коняй. Гною таксама ня хопіць. Саўгас не забясьпечаны насеньнем. **Няма зусім ільну, агародных культур.**

Зусім ня рыхтуюцца да веснавой пасеўнай кампаніі рабочыя саўгасу. Уся іх падрыхтоўка выявілася толькі ў тым, што на чарэдзьнёўні вытворчай камісіі абгаварылі плян пасеўнай кампаніі, выслучылі брыгады і... ўсё. **Пра сацспаборніцтва забыліся.**

Партыйная і камсамольская ячэйкі саўгасу бязьдзейнічаюць. Нават пляну пасеўнай кампаніі саўгасу яны не абгаворвалі.

Як кіруе Белсельтрэст?

Уявіць, прыкладам, такую баявую задачу, як арганізацыя машына-конных станцый у саўгасах. Дырэктыва аб гэтым выйшла з канцылярыі трэсту толькі 4-га сакавіка.

Або ўзяць булаўніцтва па саўгасах. У саўгасе «Станіслава» трэба было пабудаваць сьвінарнік (тут разводзіцца племянны гадавальнік), сілосную вежу і пачаць рамонт браварні. Як кіраўцы, так і каштарысаў яшчэ па гэтае будаўніцтва ў БСТ няма. Будаўнічы матэрыял павінен быў быць у саўгасе ў студзені, а яго і зараз няма.

Брыгадзір «Зьвязды» КЛІМАЎ.

НЕДАХОП КОРМУ Ў КАЛГАСАХ

З раду месц паведамляюць аб цяжкім становішчы з забесьпячэньнем жывёлы кормам. У беларускую кантору Саюзхлеба таксама паступаюць патрабаваньні з калгасаў аб водпуску корму.

Высьвятлецца, што кармавыя непаладкі выкліканы не нястачаю корму, а ў значнай ступені тым, што на мясцох абагуленьне жывёлы не адпавядала абагуленьню корму. Месны праглядзелі гэтую задачу, а цяпер расплачваюцца за сваю бясьпечнасьць. Адсутнасьць плянавасьці ў стварэньні кармавое базы можа выклікаць такое зьявішча, калі ў адным раёне будуць лішкі корму, а ў другім іх ня хопіць.

А вось прыклад з практыкі стварэньня кармавое базы ў калгасах Магілёўскай акругі суцэльнай калектывізацыі. Пры абагуленьні жывёлы абагуленьне корму было ўпушчана. Замест гэтага правялі толькі ўлік корму. Пры адкорме жывёлы ўстанавілі чарговасьць двароў. У выніку — у некаторых дварох корм выкарысталі поўнасьцю, а ў другіх яны былі захаваны. Арганізаваная ў Магілеве вялікая фэрма - калгас мае патрэбнага корму ўсяго каля 30 проц. Не хапае каля 50.000 пуд сена. Калгас дагаварыўся з Саюзхлебам аб водпуску 8.000 пуд. сена. Але пры задавальненьні заяўкі нельга будзе нават забясьпечыць гурт. Апошнімі днямі гэты-ж калгас зьвярнуўся ў Палядоўдсаюз з заяўкаю на 40.000 пуд. грубога корму, але надзеі на іх атрыманьне вельмі слабыя. Выразным прыкладам узмоцненага распродажу корму дае становішча на рынку. Сёлета загатоўкі грубога корму на Магілеўшчыне далі значна большую колькасьць, чым звычайна. Адначасова наглядаюцца надзвычай нізкія цэны на грубы корм, якія даходзяць да 80 кап. за пуд. А такія арганізацыі, як малочна - жывёлагадоўчая кааперацыя не змагаецца з распродажам корму, не стварае кармавых фондаў у калгасах. Аб тым, як паважліва на мясцох адносяцца да кармовае праблемы, паказвае той факт, што ў справаздачах аб месячніку жывёлагадоўлі зусім не ўспамінаецца аб корме.

НЯ ТОЛЬКІ КОЛЬКАСЬЦЬ, А І ЯКАСЬЦЬ

Кантрактацыя — масавае вытворчае мерапрыемства

Кантрактацыя яравых культур праходзіць слаба. На 1-га сакавіка па БССР закантрактавана 38 проц. яравых і 58 проц. ільну пры значным адставаньні Полацкай акругі, якая дала па збожжавых 16 проц. і па ільне ўсяго 22 проц. пляну. Зусім слаба праходзіць кантрактацыя пасеўных траў, паасобныя культуры якіх закантрактаваны ўсяго ад 13 да 18 проц.

Да гэтага часу яшчэ многія работнікі не ўсьвядомілі сабе, што нават пры калектывізацыі сельскай гаспадаркі роля кантрактацыі застаецца вельмі вялікай. Толькі пры кантрактацыі мы маем магчымасьць цесна ўвязаць вытворчасьць сельскай гаспадаркі з патрэбамі нашай краіны як у сырцы для прамысловасьці, так і ў прадуктах для забесьпячэньня працоўных.

Мы абавязаны праводзіць кантрактацыю значна раней, каб кожны калгас, кожная бяднякта - серадняцкая гаспадарка, на аснове заключанага дагавору, будавала сваю вытворчую праграму.

Асаблівая ўвага павінна быць звернута на якасьць работы пры правядзеньні самой кантрактацыі. Адно фармальнае падпісаньне дагавору на пэўную колькасьць прадуктаў і сырцу яшчэ не забясьпечвае выкананьня дагавору. Між тым, у справе якасьці работы становішча яшчэ горшае, чым у справе колькасьці закантрактаванай прадукцыі. Ёсьць і такія выпадкі, калі дагаворы аб кантрактацыі не абгаворваюцца ня толькі агульнымі сходамі калектываў, але нават праўленьнямі. Дагавор падпісваецца толькі старшынёю. У дагаворох не адзначаецца нават дакладна, што і колькі прыдзецца здаваць, а пішацца: «усе таварныя лішкі». Такі дакумант ня ёсьць дагавор па кантрактацыі тавернай прадукцыі, а нейкае напамінаньне калгасу, а часамі толькі старшыні калгасу, аб існуючых законах адносна здачы ўсіх лішкаў дзяржаве. Такія дагаворы нам непатрэбны. Мы павінны, на падставе цьвёрдых дагавораў аб кантрактацыі, будаваць вытворчыя пляны прамысловасьці, будаваць свае пляны забесьпячэньня працоўных. А гэтага мы можам дасягнуць толькі тады, калі дагавор абгаворваўся ўсімі членамі калгасу, дзе кожная ведае, якая алкаэнасьць ляжыць на ім. Толькі пры гэтай умове можна быць упэўненым, што калгас пасее іменна тое, што нам патрэбна.

Маюць месца і такія выпадкі, калі дагавор па кантрактацыі ня ўлязвецца з тымі вытворчымі крэдытамі, якія даюцца калгасам або бяднякта - серадняцкім гаспадаркам. Не даволі растлумачваецца кожнаму члену калгасу, што вытворчая дапамога павінна быць залічана, як аванс з боку дзяржавы данай гаспадарцы на тыя таварныя лішкі, якія яна будзе здаваць дзяржаве. Такая ўвязка вытворчых крэдытаў з кантрактацыяй яшчэ больш замацуе адказнасьць кожнага члена калгасу за выкананьне дагавору.

Хоць часу засталося і мала, але мы яшчэ можам і павінны за час, што застаўся да 1-га красавіка, ня толькі скончыць кантрактацыю на ўсе 100 проц., але і паленшыць не якасьць.

АЁРАМСОН.

Антысавецкія пляны фашысцкага ўраду Польшчы

Старшыня сэнату спыняе прамоўцу, які прагаварыўся

ВАРШАВА, 14. У польскім сэнаце з прамовай аб замежнай палітыцы выступіў прадстаўнік нацыянал - дэмакратаў сэнатар Казіцкі. Значную частку свае прамовы Казіцкі прысьвяціў пытаньню аб польска - савецкіх адносінах.

Зазначаючы, што асноўная лінія польскае палітыкі павінна заключацца ў тым, каб не дапускаць савецка - нямецкага збліжэньня і адначасова шукаць параўменьня з СССР, Казіцкі падкрэсьлівае, што на данай стадыі польская палітыка павінна грунтавацца **на прынцыпе захаваньня мірнае пазыцыі ў адносінах да СССР** і неўмяшальнасьці ва ўнутраныя савецкія справы. Існуюць фактары, у сілу якіх думаюць **выкарыстаць Польшчу ў выпадку наступленьня яких - небудзь падзей у СССР.** Я не хачу — заяўляе Казіцкі— разглядаць тут магчыма гэта ці немагчыма. Але існуюць колы, якія прадбачаць, што ў выніку няўдач пяцігодкі і аграрнае рэформы...

Гэту фразу, у якой прадстаўнік нацыянал - дэмакратыі яшчэ раз падкрэсьлівае існаваньне антысавецкіх пляноў, прамоўцы скончыць не ўдасьцца. Старшыня сэнату, член уралавага блеку Шыманскі, раптоўна, пад вельмі характэрнаю прычынаю спыняе Казіцкага:

«Зварачаю ўвагу прамоўцы на тое, каб ён ня ўмешваўся ва ўнутраныя адносіны іншых дзяржаў».

Заява Шыманскага выклікае зьдзіўленьне Казіцкага. Зварачаючыся да старшыні, Казіцкі падкрэсьлівае, што ён якраз і гаворыць аб гэтым, што ня трэба ўмешвацца ва ўнутраныя справы Савецкага Саюзу. — Наколькі існуе вышэазначанае імкненьне — канчае Казіцкі — я лічу неабходным заявіць, што грамадзкая думка Польшчы, прынамсі самая значная яе частка, незалежна ад палітычных паглядаў, стаіць на пазыцыі захаваньня міру і неўмяшальнасьці ва ўнутраныя справы Расіі.

***

Выступленьне Казіцкага заслугоўвае ўвагі з двух пунктаў гледжаньня. З аднаго боку, сьледам за лідэрам сялянскае партыі Домбскім прадстаўнік нацыянал - дэмакратаў лічыць патрэбным — што вельмі сымптаматычна — зноў папярэдзіць супроць імкненьня пэўных колаў, якія стараюць антысавецкія пляны. З другога боку — што ня менш сымптаматычна — прамову Казіцкага, які выступае супроць вайсковых пляноў, прадстаўнік уралавага блеку, старшыня сэнату Шыманскі прабуе спыніць пад выглядам неабходнасьці «неўмяшальнасьці ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў».

Трэба думаць, што Шыманскі наўрад ці меў на ўвазе неўмяшальнасьць ва ўнутраныя справы СССР, бо яшчэ гэтымі днямі ў сэнаце была прынята інтэрпэляцыя сэнатара Цюльле, якая прадстаўляла грубейшы ўзорчык такое ўмяшальнасьці. Старшыня сэнату Шыманскі і ўрадавы блёк, прадстаўніком якога ён зьяўляецца, горача палтрымалі гэту інтэрпэляцыю. Гэты момант надае выступленьню Шыманскага асаблівы палітычны сэнс. («Известия»).

***

«Газэта Варшавска» паведамляе, што нейкі кёндз Арачэўскі абяжджае польскія гарады з антысавецкімі дакладамі, у якіх падкрэсьлівае, што адзіны чалавек, які можа павесьці Польшчу на барацьбу супроць бальшавізму, гэта маршал Пілсудзкі. У Львове вайсковыя заклікі Арачэўскага выклікалі такі бурны пратэст аўдыторыі, што Арачэўскаму ўдалося алысьці цэлым толькі пад аховаю паліцыі.

За належнасьць да прафсаюзаў звальняюць з працы

На дрэваапрацоўчым заводзе ў Горадні забаставала 700 рабочых. Прычыны забастоўкі—пастанова адміністрацыі аб звальненьні з працы 250 рабочых за належнасьць да прафсаюзных арганізацый. Адміністрацыя адмаўляецца ад перагавораў з рабочымі і наймае штрэйк брэхэраў. Работніцы па гэтай фабрыцы заробляюць ад 1,8 злотых да 3,50 злотых штодзённа (г. зн. ад 40 да 70 кап.).

Умовы аховы працы страшэнныя. На працягу двух тыдняў адбылося некалькі дзесяткаў няшчасных выпадкаў. Пакалечаныя выкідаюцца на вуліцу.

Францускі пралетарыят падрыхтоўвае забастоўку на 1 мая

ПАРЫЖ, 15. Адкрыўся пленум ЦК рэвалюцыйнай унітарнай канфэдэрацыі працы. На паладку дня пленуму стаяць пытаньні падрыхтоўкі палітычнай забастоўкі ў дзень 1-га мая і падрыхтоўкі да 5-га кангрэсу Прафінтэрну, пытаньне аб барацьбе з апартуністычным крылом у канфэдэрацыі, якое вядзе падрыўную фракцыйную работу.

У дзень 1-га мая францускі пралетарыят, парваўшы з усімі рэфармістымі, аберне міжнароднае сьвята працы ў баяное клясавае палітычнае выступленьне, ня гледзячы ні на мабілізацыю ўсіх рэакцыйных сіл, ні на саюз з імі сацыял-фашыстых і сабатаж з боку апартуністых ва ўласных прафсаюзных радах. Масавая палітычная забастоўка і падрыхтоўка да яе будуць праходзіць пад знакам пастаўных асноўных патрабаваньняў: «Супроць капіталістычнае рацыяналізацыі, за ўсеагульнае павышэньне зарплаты, за 7-гадзінны рабочы дзень і павялічэньне зарплаты, супроць інсцэніроўкі камуністычнае змовы на барацьбу з апартуністымі, якія разлагаюць і паралізуюць рабочыя сілы, за зьнішчэньне дэмакратычных ілюзій у рабочай клясе». (ТАСС).

УКРАІНСКАЯ КОНТРРЭВАЛЮЦЫЯ ПЕРАД ПРАЛЕТАРСКІМ СУДОМ

РЭЙД ЦЮЦЮНІКА ПАДРЫХТОЎВАЎ ПОЛЬСКІ ГЕНШТАБ; ШПІЁНСКАЯ ПРАЦА „СВУ"

ДАЛЕЙШЫ ДОПЫТ НІКОЎСКАГА

ХАРКАЎ, 16. На працэсе «Саюзу Вызваленьня Украіны», у часе допыту Нікоўскага, абвінавачаны гаворыць, што падрыхтоўка рэйду Цюцюніка праводзілася на ўзгадненьні з адпаведнымі прадстаўнікамі польскага вайсковага камандаваньня, а таксама пад наглядам польскай вайсковай арганізацыі, генэральнага штабу і польскіх капітанаў. У Львове, пад кааперацыйнаю шыльдаю кабака ў канцы 1921 году працавала арганізацыя Цюцюніка, які пры дапамозе генэральнага штабу меў шпіёнскую сетку на мяжы Савецкага краю. Цюцюнік меў таксама сваю агэнтуру ў глыбіні тэрыторыі Украіны. Гэтай агэнтуры была дадзена дырэктыва перашкаджаць спагнаньню праналогу, затрымліваць і зьнішчаць цягнікі з харчамі і зьнішчаць сувязь.

У лістападзе 1921 году, пры ўдзеле Пятлюры, адбылася нарада, на якой Цюцюнік нарысаваў аптымістычную пэрспэктыву, што, моў, уся Украіна пакрыта сеткаю арганізаваных і дысцыплінаваных контр - рэвалюцыйных паўстанцкіх груп пад пэўным лёзунгам — арганізаваць паўстаньне, падымаць сяло супроць бальшавікоў, захопліваць харчы, зброю, сувязь. На гэтай нарадзе і быў распрацаваны стратэгічны плян «Пад уплывам усяго гэтага — апавядае Нікоўскі — я разам з другімі падпісаў пастанову аб рэйдзе Цюцюніка». У тымжа часе пад загад Цюцюніка было перадана 1.800 казакаў — войск Украінскае народнае рэспублікі, — інтэрнаваных у Польшчы. (ТАСС).

Што рыхтаваў „СВУ" для працоўных Савецкае Украіны

Увага працоўных мас усяго Савецкага Саюзу, а асабліва Савецкай Беларусі зараз зьвернута на Харкаў, дзе 9-га сакавіка пачалося слуханьне працэсу агентаў польскага фашызму — украінскай контр - рэвалюцыйнай арганізацыі «СВУ». Гэта контр - рэвалюцыйная арганізацыя, якая мела свае філіялы ў цэлым гадзе гарадоў Савецкай Украіны, складалася пераважна з прадстаўнікоў буржуазнай украінскай інтэлігенцыі, з сыноў абшарнікаў, паноў і г.д. Прыкрываючыся высокім імем навукі, высокаю годнасьцю навуковых працаўнікоў Кіеўскага, Палтаўскага, Адэскага ІНО, мэдыцынскага інстытуту, усеукраінскай акадэміі навук, годнасьцю членаў сэкцыі Усеукраінскай акадэміі навук і г. д. і г. д. — гэтыя агенты міжнароднага імпэрыялізму імкнуліся пры дапамозе замежнага капіталу ўзброенай рукой зьвяргнуць савецкую ўладу і ўстанавіць дыктатуру буржуазіі, дыктатуру фашызму. Яны імкнуліся разбурыць тое тіганцкае сацбудаўніцтва, якое зараз пралетарыят Савецкай Украіны, у саюзе з працоўным сялянствам, пад кіраўніцтвам кампартыі вядзе ў краі, яны кавалі ланцугі для пралетарыяту і працоўных Украіны.

І сапраўды Украіна, якая да сусьветнай вайны зьяўлялася калёніяй расійскага царызму, якая была аб'ектам ганебнай эксплёатацыі чужаземнага капіталу — зараз на гэтай Украіне пад кіраўніцтвам кампартыі шпаркім тэмпам будуецца сацыялізм. Пабудова вялізарнейшае ў сьвеце электрастанцыі на Дняпры (Днепрэсгэс), пабудова Харкаўскага трактарнага заводу, мэталюргічнага волату ў Марыупалі з прадукцыйнасьцю ў 4,5 млн. тон чыгуну ў год, пашырэньне прадукцыйнасьці Запароскага мэталюргічнага заводу да 3½ млн. тон, Крыўароскага — да 1.150 тысяч тон, папярэньне хэмічнага камбінату ля Днепрастроя, пабудова новых энэргэтычных баз—раённых электрастанцый у Штэраўцы, Кіеве, Харкаве і Зуеўску, 814 млн. руб. капітальных укладаньняў у прамысловасьць Украіны — вось жменька фактаў, якія аж надта выразна гавораць аб тэй грандыёзнасьці сацбудаўніцтва, якое зараз вядзе рабочая кляса пад кіраўніцтвам кампартыі на Украіне.

У гэтым годзе украінскі трэст с.-г. машын выпускае на **233,5 млн. руб. с.-г. машын супроць 27 млн. руб. у 1912 годзе.**

Кастрычніцкая рэвалюцыя перадала працоўнаму сялянству Украіны 14,5 млн. гэкт. памешчыцкай зямлі. Зараз украінскі селянін — батрацтва, бядняцтва і серадняцтва пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго партыі, вядуць карэнную перабудову сельскае гаспадаркі на аснове калектывізацыі. **17.000 трактараў выйдзе гэтай вясною на палі Украіны.** 25.000 калектываў, якія аб'ядноўваюць 8½ млн. сялянскіх гаспадарак, 32 акругі. суцэльнай калектывізацыі — вось вынікі індустрыялізацыі Украіны, гэрачнае творчасьці працоўных мас.

Нельга абыйсьці моўчкі і фронту нацыянальна - культурнага будаўніцтва. На грунце пасьпяховага правядзеньня сацбудаўніцтва шпаркім тэмпам расьце і культурнасьць мас. Ужо ў 1930-31 годзе Савецкая Украіна канчаткова ліквідуе нясьпісьменнасьць. **21.000 працоўных школ, з іх 17.500 украінскіх,** 1.060 расійскіх, 291 яўрэйская, 2.140 іншых—вось лічбы, якія надта выразна гавораць аб росьце культуры працоўных мас. Акрамя гэтага ў 39 інстытутах Украіны зараз вучыцца **48.000 студэнтаў,** а разам з студэнтамі тэхнікумаў — **72.000,** і то пераважна дзяцей рабочых і працоўнага сялянства. Да канца пяцігодкі ва ўсіх украінскіх ВНУ будзе вучыцца **142.000 студэнтаў** — новых пралетарскіх кадраў — будаўнікоў украінскай савецкай культуры. Сотня навукова - даследчых катэдраў, інстытутаў і акадэмія навук завяршаюць сабою культурны будынак Савецкай Украіны.

Вось малюнак таго **грандыёзнага, нябачнага гісторыяй, сацыялістычнага будаўніцтва, якое зараз разгортваецца на Савецкай Украіне.**

І вось, контр - рэвалюцыянэры з «СВУ

Аб выдучэньні рабочых у савецкі апарат і масавым рабочым кантролі зьнізу над савецкім апаратам

АБ ШЭФСТВЕ ЗАВОДАЎ

ПАСТАНОВА ЦК І ЦКК УсеКП(б)

1. ЦК і ЦКК надаюць вялікае значэньне пачатай за апошнія месяцы разгортванцу над кіраўніцтвам КК-РСІ. у сувязі з чысткай савецкага апарату, ма савай барацьбе рабочых з бюракратызмам і іншымі недахопамі савецкага апарату ў форме шэфства заводаў і фабрык над савецкімі установамі. Гэта форма масавага рабочага кантролю зьнізу, якая вырасла з павышэньня палітычнай актыўнасьці рабочае клясы на аснове гаспадарчага ўзьдыму краіны і наступленьня на капіталістычныя элементы, прадстаўляе адну з лепшых форм удзелу рабочых, якія застаюцца на выдворчасьці, у кіраваньні дзяржавай. Гэта форма прадстаўляе сабою новы буйны крок на шляху ажыцьцяўленьня ідэі Леніна аб тым, што «мэтай нашай зьяўляецца бясплатнае выканаўнае дзяржаўных абавязкаў кожным працоўным пасьля адбыцьця 8-мігадзіннага ўроку вытворчай работы».

2. Гэта форма масавага, арганізаванага зьнізу кантролю рабочых, які распачаўся, на першых-жа кроках дала значныя вынікі і паказала, што яна ўдзяляецца найлепшым сродкам у барацьбе з бюракратызмам, што яна прыносіць вялікую карысьць у справе ачышчэньня савецкага апарату ад бюракратычных і чужых элементаў, у справе скарачэньня, паляпшэньня работы і паганяньня савецкага апарату. Удзел рабочых брыгад у чыстцы МАСПС даў магчымасьць скараціць апарат амаль на палову і значна спрасьціць яго. Рабочыя брыгады сабралі на саюзе каля 25 мільёнаў рублёў нядоімак прыватнага сэктару і г. д.

Адначасова ЦК і ЦКК падкрэсьліваюць, што на месцах нярэдка мае месца недапушчальнае зьнішча. калі шэфства зводзіцца да ўрачыстых пасяджэньняў і фармальнага падпісваньня дагавору аб шэфстве, без якой-бы тым ні было практычнай работы па паляпшэньні дзяржапарату, абмежаваўшыся нікому непатрэбнай і шкоднай нядбайнасьцю.

3. Вялікае значэньне шэфства заключаецца ня толькі ў дапамозе РСІ ў часе чысткі савецкага апарату. ЦК і ЦКК лічаць, што асноўная задача рабочага масавага кантролю зьнізу заключаецца ў тым, каб па скончэньні чысткі шэфы заводы прымацоўвалі свае рабочыя брыгады, пад кіраўніцтвам РСІ, для пастаяннага, сыстэматычнага кантролю над выкананьнем з боку паасобных частак апарату падшэфнае ўстановы важнейшых дырэктыў партыі і ўраду. Такое прымацаваньне і практычная праверка работы рабочымі брыгадамі дапаможа правядзеньню выразнай клясавай лініі ў рабоце апарату, сыстэматычнаму яго ачышчэньню ад пяголных і бюракратычных элементаў і далейшаму спрашчэньню яго работы. Такое ўцягненьне рабочых у пастаянную праверку і работу савецкіх устаноў узмацніце сапраўдную сувязь рабочых з савецкім апаратам.

4. ЦК і ЦКК адзначаюць, што прыцягненьне рабочых брыгад да масавай праверкі і кантролю над работай савецкага апарату, на аснове іх штодзеннага азнаямленьня з практычнай работай у савецкіх установах, мае вялікае значэньне ў справе падрыхтоўкі кадраў з асяродзішча пралетарыяту, зусім прыгодных для вылучэньня на пастаянную адказную работу ў савецкім апараце.

5. Улічваючы асабліва важнае значэньне гэтага масавага рабочага кантролю над савецкім апаратам. ЦК і ЦКК прапануюць усім партыйным арганізацыям аказваць разьвіцьцю шэфства заводаў самую сур'ёзную ўвагу і падтрыманьне. Органы КК-РСІ. якія непасрэдна стаяць на чале гэтага руху рабочых мас, павінны самым уважлівым чынам працягваць кіраўніцтва шэфствам, аказваючы яму сыстэматычную дапамогу ў арганізацыі сыстэматычнага кантролю рабочых мас над савецкім апаратам.

6. Бліжэйшыя задачы шэфствуючых заводаў-фабрык павінны заключацца ў тым, каб пад кіраўніцтвам РСІ: а) вылучаць рабочыя брыгады для актыўнага ўдзелу ў чыстцы савецкага апарату; б) палібраць вылучэнцаў з ліку актыўных удзельнікаў шэфскіх брыгад, што займаліся чысткаю данае установы, для пастаяннай работы ў апараце апошняй; в) прымацоўваць на скончэньні чысткі рад рабочых брыгад да паасобных важнейшых частак падшэфнага апарату для пастаяннай праверкі і нагляду за правільнасьцю работы гэтых частак; г) шэфскія заводзкія брыгады ператвараюцца ў ініцыятыўных памочнікаў РСІ ў падшэфным апараце, правяраюць хуткасьць і якасьць выкананьня важнейшых пастаноў партыі і ўраду, сочаць за паганеньнем і скарачэньнем апарату. выяўляюць якасьць работы супрацоўнікаў і г. д.; д) шэфскія брыгады павінны сыстэматычна дакладваць аб выніках сваёй работы на заводзкіх сходах і на пасяджэньня калегіі РСІ; е) кіраўнікі. што стаяць на чале падшэфных устаноў, павінны аказваць усямерную дапамогу рабочым брыгадам і павесьці рашучую барацьбу, апіраючыся на іх, з бюракратызмам і іншымі недахопамі савецкага апарату. Яны—кіраўнікі—павінны рабіць справаздачы аб сваёй рабоце на сходах заводаў-шэфаў, з абавязковым судакладам рабочых брыгад.

7. ЦК і ЦКК прапануюць у самы кароткі тэрмін дабіцца рашучага пералому ў рабоце па вылучэньні рабочых і рабоніц у савецкі апарат, не дапускаючы фармальнага кампанейскага падыходу. а вядучы сыстэматычную работу па вылучэньні. Асноўным рэзэрвам для папаўненьня і ўмацаваньня дзяржапарату павінны быць шэфскія брыгады, рабочы-ўдарнікі. члены саветаў і іх сэкцыі. У прыватнасьці, трэба вылучаць з радоў пралетарскай інтэлігенцыі з рабочых, скончыўшых рабфакі, тэхнікумы, ВНУ і г. д.

Адказнасьць за сыстэматычнае ўцягненьне рабочых у дзяржапарат, кіраўніцтва работай вылучэнцаў, стварэньне для іх нармальных умоў работы і павышэньне іх кваліфікацыі ўскладаецца на кіраўнікоў устаноў.

8. Адзначаючы невыстарчальную ўвагу, якая аказвалася да гэтага часу шэфскаму руху з боку партыйных арганізацый, а таксама невыстарчальнае і няўмелае кіраўніцтва з боку многіх мясцовых органаў КК-РСІ, ЦК і ЦКК абавязваюць партыйныя камітэты, ячэйкі шэфствуючых заводаў і мясцовыя КК-РСІ ўсямерна падтрымліваць шэфства, разглядаючы яго, як важнейшую частку масавай работы на прадпрыемствах.

9 ЦК і ЦКК асобна адзначаюць, што прафсаюзы, саветы і камсамольскія арганізацыі прымаюць слабы ўдзел у справе арганізацыі і дапамогі мясцовым брыгадам. ЦК і ЦКК лічаць, што прафсаюзы ў большай меры, чым да гэтага часу, павінны прыняць актыўны ўдзел у справе арганізацыі масавага кантролю рабочых над савецкім апаратам. Шэфства і вылучэньне рабочых і работніц павінна стаць адной з важнейшых форм удзелу прафсаюзаў у барацьбе з бюракратызмам у савецкім апараце. Саветы і іх сэкцыі павінны больш зьвязацца з работай шэфскіх брыгад, а дэпутаты саветаў на прадпрыемствах павінны стаць перадавымі арганізатарамі масавага шэфскага руху.

Камсамольскія арганізацыі павінны больш актыўна ўдзельнічаць у барацьбе з бюракратызмам у савецкім апараце і побач з арганізацыяй «лёгкай кавалерыі» быць у перадавых радох шэфскіх брыгад.

10. Для правільнага накіраваньня работы шэфаў-заводаў ЦК і ЦКК лічаць неабходным павесьці барацьбу супроць падмены ідэй шэфства ідэяй «узаемнай праверкі і ўзаемнага кантролю паміж заводамі і савецкімі ўстановамі Такі падыход да шэфства зьяўляецца скажэньнем яго асноўнага сэнсу і характару. Асноўная задача шэфства заключаецца ў масавым уцягненьні рабочых брыгад у справу дзяржаўнага кіраваньня і кантролю зьнізу над савецкім апаратам. Гэта ідэя павінна быць кіраўнічай і асноўнай пры практычным разгортваньні шэфства.

Побач з неабходнасьцю забясьпечыць выстарчальнае кіраўніцтва шэфскім рухам з боку КК-РСІ, ЦК і ЦКК лічаць неабходным перасякаць усякія спробы лішняга рэгламентаваньня шэфства, якія ўганяюць гэты здаровы рух у вузкія рамкі бюракратычных статутаў, звужаюць або паслабляюць ініцыятыву і актыўнасьць рабочых мас у барацьбе з бюракратызмам, а таксама з такімі недапушчальнымі бюракратычнымі зьявішчамі, калі дагавары аб шэфстве заключаюцца бяз удзелу рабочых, паасобнымі прадстаўнікамі заводаў і ўстаноў.

11. ЦК і ЦКК прапануюць органам друку шырока асьвятляць гэту новую форму масавага рабочага кантролю, знаёмячы рабочых і сялянскія масы як з найбольш удалымі вопытамі ў арганізацыі шэфства, так і з важнейшымі вынікамі работы шэфствуючых заводаў, па магчымасьці шырэй прыцягваючы да гэтае справы самых удзельнікаў кантролю.

Цэнтральны Камітэт УсеКП(б).
Цэнтральная Кантрольная Камісія УсеКП(б).

Новы атрад чырвоных спэцыялістаў

Супроць настрояў аб ліквідацыі праўнай асьветы

Посьпехі сацыялістычнай рэканструкцыі, узмацненьня плянава-рэгулюючай ролі дзяржавы ў народнай гаспадарцы выклікаюць глыбокія зьмены і ў галіне праўных адносін. Але гэта ні ў якім разе не азначае, што ўжо наступіў час, калі мы можам гаварыць аб зьнікненьні права. Такая недыялектычная пастаноўка пытаньня азначае неразуменьне таго, што ў пэрыяд разгорнутага сацыялістычнага наступленьня пралетарыяту клясавая барацьба не патухае, а вельмі абвастраецца; гэта азначае неразуменьне таго, што дзяржаўныя органы, заканадаўства, суд і права зьяўляюцца ў руках пралетарыяту сродкам сацыялістычнага будаўніцтва і тым самым ліквідацыі клясаў. Вось чаму ўсякія настроі і гутаркі аб ліквідацыі праўнай асьветы, усякія імкненьні паасобных таварышоў угрунтаваць гэты свой погляд вучэньнем Маркса і Леніна аб адміраньні права і дзяржавы зьяўляюцца, як гэта зусім правільна адзначыла ў сваёй рэзалюцыі ўсесаюзная нарада па падрыхтоўцы кадраў пры Кам. Акадэміі: «перапляценьнем настрояў правага ўхілу і левых загібаў як у тэорыі, таксама і на практыцы».

Новы, больш высокі этап нашага разьвіцьця патрабуе ад працаўнікоў у галіне рэвалюцыйнай законнасьці асабліва акрэсьленага клясавага пачуцьця, уменьня арыентавацца ў палітыцы нашай партыі і савецкай улады, і асабліва пільна сачыць за ўсімі манэўрамі клясавага ворага. Не забываць таксама, што праўная галіна на новым этапе разьвіцьця яшчэ больш адкідае ў бок элементы фармальна-дагматычныя і дае рашучую перавагу палітычна-арганізацыйным элементам.

Новыя запатрабаваньні нашай гаспадаркі і савецкага будаўніцтва вымагаюць ад дзяржавы перабудовы сыстэмы падрыхтоўкі кадраў, больш выразнай спэцыялізацыі студэнта. У сувязі з гэтым праўгас перабудаваўся пановаму. Зараз мы маем замест аднаго факультэту два: а) факультэт народнай гаспадаркі і б) факультэт савецкага будаўніцтва і права.

Апошні, падзяляючыся на два аддзяленьні, будзе рыхтаваць у далейшым кадры работнікаў, патрэбных для савецкага будаўніцтва, для розных зьвяньняў арганізацыйна-адміністрацыйнага, гаспадарчага апарату і органаў аховы рэвалюцыйнага парадку, а таксама работнікаў па лініі праўнага афармленьня эканамічных адносін — гаспаларнікаў - правазнікоў.

Наш сёньнешні выпуск мы прысвячаем да адкрыцьця і новага факультэту. Праблема кадраў—адна з цэнтральных праблем нашай палітыкі. Ад яе выраўнаньня залежаць далейшыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва.

Трэба, каб уся наша савецкая грамадзянасьць, каб усе арганізацыі і органы, якія маюць непасрэднае дачыненьне да гэтага пытаньня, максымальна разьвілі свае тэмпы па стварэньні спрыяючых умоў у выкананьні задач, якія стаяць перад новым факультэтам.

Факультэт-жа—студэнцтва і выкладчыкі калектыў—бяры на сябе абавязак выканаць гэтыя задачы з максымальнай энэргіяй і ўсьведамленьнем свайго абавязку перад пралетарскай дзяржавай.

Ён павінен стаць ударным.

Н. КАНАПЛІН.

Да выпуску праўгасу БДУ

Пэрыяд бурнага росту сацыялістычнага будаўніцтва, які мы перажываем, і пасьпяховае наступленьне па рэшткі капіталістычных элемэнтаў у горадзе і вёсцы з усёй закономернасьцю выклікаюць абвастраньне клясавай барацьбы ўнутры краю.

Перад савецкімі юрыстымі на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва стаіць адказьнейшая задача па правядзеньні выразнай клясавай пралетарскай лініі ў судовых органах.

Сёньня БДУ выпускае са сваіх мураў новы атрад чырвоных спэцыялістых для судовых устаноў з рабочых, батракоў, бядняцка-серадняцкіх мас і сумленных савецкіх служачых у колькасьці 60 асоб.

Таварышы - выпускнікі! Памятайце, што камуністычная партыя, пралетарыят, БДУ, які створаны і існуе, дзякуючы вялікай пралетарскай рэвалюцыі, і ўся савецкая грамадзянасьць патрабуюць ад вас поўнага апраўданьня пралетарскага давер'я ва ўсёй вашай практычнай рабоце, да якой вы прыступіце заўтра.

Шляхам правядзеньня цьвёрдай пралетарскай лініі ў судовых працэсах расчышчайце шырокія шляхі для пасьпяховага і шпаркага сацыялістычнага будаўніцтва.

Шчыра жадаю вам, таварышы-выпускнікі, посьпехаў у вашай надыходзячай практычнай рабоце на карысьць пралетарскай рэвалюцыі і цьвёрда ўпэўнены, што вы будзеце і па скончэньні універсытэту трымаць з ім цесную сувязь, які заўсёды зробіць вам пасільную для яго і патрэбную вам дапамогу.

Рэктар БДУ КАРАНЕЎСКІ.

Зьмене

Паскораны выпуск праўгасу зьяўляецца адным з момантаў практычнага ажыцьцяўленьня дырэктыў лістападаўскага пленуму ЦК КП(б)Б аб кадрах.

Дырэктывы лістападаўскага пленуму абумаўляюць ня толькі паскораны выпуск, але і тыя задачы, якія стаяць перад кожным, хто канчае сваю асьвету. Задачы, якія стаяць перад кожным з выпускнікоў праўгасу, заключаюцца перш за ўсё ў тым, каб быць правадніком і абаронцай тае клясавае палітыкі, якая вызначае сабой увесь сучасны тэмп сацыялістычнага будаўніцтва ў краі. Гэта значыць, умець папралетарску, памаркысцку разабрацца ў тых складаных пытаньнях судовай практыкі, з якімі ім прыдзецца сутыкацца.

Мы ўпэўнены, што нашы выпускнікі зьявяцца надзейнай зьменай тым работнікам, якія ня ў стапе ахоўваць таго адказнага вучастку савецкага будаўніцтва, які ім даручаны.

ВАЛЬФСОН.

ДА АГЛЯДУ МІЖЗБОРАВАЙ РАБОТЫ

У ЦСПСБ ня ведаюць аб аглядзе міжзборавай работы

Які сэктар будзе займацца гэтай справай?

Паводле заданьня газ. «Зьвязда» мы праверылі, што зроблена ЦСПСБ па аглядзе міжзборавай работы.

На руках у нас былі ўжо матар'ялы з дакладу пралетарыка ЦСПСБ на пасяджэньні цэнтральнага штабу агляду т. Юдоўскага аб тым, што ЦСПСБ склікана нарада ЦП саюзу па пытаньнях агляду, а сам апарат ЦСПСБ правёў самаправерку гэтай работы ў сябе.

Зайшлі мы ў ЦСПСБ 15-га сакавіка, а даклад Юдоўскага ў штабе быў 8-га. Напэўна работа пры сучасных тэмпах далёка прайшла наперад.

Гутарым з адказнымі работнікамі арганізацыйнага сэктару. Яны шчыра прызналіся, што само слова міжзборавая работа для іх зусім не зразумела, а аб самім аглядзе яны нічога ня ведаюць. Ніякіх кіраўнічых матар'ялаў па гэтым пытаньні ня чыталі.

І гэта пасьля таго, як афіцыйны прадстаўнік, т. Юдоўскі, заявіў, што апарат ЦСПСБ правёў па пытаньні міжзборавай работы самаправерку.

Як займаецца т. Юдоўскі пытаньнямі міжзборавай работы, мы высьвятліць не змаглі, бо ён якраз быў выхадны, але з вынікамі яго работы мы крыху азнаёміліся.

Аказваецца, што ЦСПСБ выпусьціў за подпісам т. Юдоўскага цыркуляр, у якім «даводзіцца да ведама, што з 1-га сакавіка праводзіцца агляд міжзборавай работы, які абхопіць саюзы мэталістых, будаўнікоў і гарбароў. Прапануецца камісіям дапамагаць і прыняць удзел у іх рабоце».

Паміж іншым, на цыркуляры пастаўлена дата 1-III, ЦП яна атрымана 5-III. Акрамя таго, чаму ўзяты толькі тры саюзы, калі праводзіцца масавая самаправерка. Наогул, больш бюракратычнага цыркуляру цяжка напісаць. Ні аднаго слова аб значэньні гэтай работы, ні аднэй практычнай прапановы.

Цікава было паглядзець, як адбіўся гэты цыркуляр у ЦП саюзу.

Зайшлі ў саюз швэйнікаў. Пытаемся, што робіцца ў вас па дырэктыве ЦСПСБ? Кіраўнік справам доўга капаўся ў паперах і знайшоў названы цыркуляр, а на ім сябра прэзыдыуму тав. Рэйзін налажыў рэзалюцыю «да ведама». Ясна, паколькі ЦСПСБ даводзіць да ведама, дык ЦП яго да ведама прымае і падшывае да справы.

Старшыня ЦП саюзу друкароў т. Левін і мастацтва т. Іванова ня чыталі ніякай дырэктывы ЦСПСБ і аб аглядзе нічога ня ведаюць.

А ў саюзе будаўнікоў, які паводле цыркуляру абсьледуецца, напісана паперка ўсім рабочкомам, дзе таксама «даводзіцца да ведама і прапануецца садзейнічаньне». Сябра прэзыдыуму ЦП, з якім мы гутарылі, сам ня ведае, хто будзе расьсьледаваць «Мусіць з АСО прыдуць». Ні на прэзыдыуме, ні на нарадзе гэта пытаньне не стаяла. ЦП ня ведае, што-ж канкрэтна робіцца ў саюзе з аглядам «ЦСПСБ напісаў паперку і мы таксама паперку напісалі».

Культпропсэктар ЦСПСБ у асобе тав. Клімковіча таксама прызнаўся, што ён аб аглядзе міжзборавай работы даведаўся, калі некаторыя саюзы прыходзілі за тлумачэньнем цыркуляру. Ён гэтых людзей пасылаў да тав. Юдоўскага. Культпроп і цяпер нічога ня ведаў, як праходзіць агляд.

Аб 3-хдзённым зборы пераменнага складу ні ЦСПСБ, ні ЦП саюзаў нічога ня ведаюць. У гэтым вінаваты і Падзіў 2, які ніколі пытаньняў збору ня ставіў перад ЦСПСБ.

Даўшы некаторыя практычныя паказаньні саюзу будаўнікоў, як праводзіць праверку і дагаварыўшыся з т.т. Клімковічам і Калодкам аб пастаноўцы пытаньняў міжзборавай работы 24-га на прэзыдыуме ЦСПСБ, мы пакінулі Дом Працы.

Брыгада «Зьвязды».

Тэзісы для дакладаў „Парыская Камуна і МОПР"

Камуна 1871 года ўзьнікла на руінах французкай манархіі. Франка-пруская вайна, якая скончылася зьвяржэньнем Напалеона III, паглыбіла цяжкае становішча парыскага пралетарыяту. Урад «нацыянальнай абароны», пад кіраўніцтвам Т'ера, працягваў палітыку прыгнечаньня працоўных Узьнікшае рэвалюцыйнае паўстаньне парыскага пралетарыяту скончылася абвяшчэньнем Камуны 18 сакавіка 1871 г. і ўцёкам Т'ера ў Вэрсаль.

На працягу 72 дзён свайго існаваньня Парыская Камуна радам мерапрыемстваў (рабочы кантроль над вытворчасьцю, частковае ўвядзеньне сацыяльнага страхаваньня, перадача рабочым арцелям раду прамысловых прадпрыемстваў уцёкшай буржуазіі, аддзяленьне царквы ад дзяржавы) прабавала закласьці аснову новага сацыялістычнага грамадзтва

Аднак, буйныя памылкі і аб'ектыўныя труднасьці Камуны прывялі яе да паражэньня: а) невыстарчальная рэвалюцыйная барацьба з буржуазіяй, накіраваньне прыватнай уласнасьці: Камуна не нацыяналізавала нават цэпнасьцяй Нацыянальнага Банку (больш 2 мільярдаў франкаў); б) адсутнасьць маналітнай клясавай партыі пралетарыяту, здольнай кіраваць справаю Камуны; наяўнасьць у радох Камуны дробна-буржуазных, наўстоўлівых элементаў; в) адсутнасьць падтрыманьня Парыскай Камуны з боку усяго французкага і міжнароднага пралетарыяту; г) не ўцягнута было ў рэвалюцыйную барацьбу працоўнае сялянства.

Паводле прыблізных падлікаў белы тэрор пасьля ўпаду Камуны сілак прускага мілітарызму вызначаецца ў наступных лічбах: забіта звыш 30.000 чал.; арыштавана і жорстка пакарана 15.000 чал. Крыважэрны сабака буржуазіі Т'ер пісаў з гэтага поводу: «Зямля ўсенна іх трымані. Гэта жахлівае відовішча паслужыць ім навукай»

Праз сорак шэсьць год пасьля абвяшчэньня Камуны 1871 г. расійскі пралетарыят, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, ажыцьцёўіў ідэі парыскіх камунараў. Уладзімер Ільліч потым гаварыў:

«Савецкая ўлада ёсьць другі сусьветна-гістарычны крок або этап разьвіцьця дыктатуры пралетарыяту. Першым крокам была Парыская Камуна» (т. XVI).

Вялікая роля сацыялістычнага будаўніцтва СССР у міжнародным рэвалюцыйным руху вынікае з чатырох асноўных момантаў, якія характарызуюць цяперашні стан капіталізму: сусьветны эканамічны крызіс і нябывалы рост беспрацоўя; падругое, паляпшэньне рабочае клясы, перарастаньне эканамічных бояў пралетарыяту ў палітычныя; патрэцце, няўхільны рост сацыялістычнага будаўніцтва Савецкага Саюзу і, пачацьвертае, цкаваньне СССР, якое ўзмацніпася ,у імпэрыялістычных краінах.

На падставе супярэчнасьцяй капіталізму (перавытворчасьць, звужаньне сьмістасьці ўнутраных і замежных рынкаў, з прычыны паніжэньня пакупной здольнасьці насельніцтва), якія абвастраюцца і эксплёататарскіх метадаў рацыяналізацыі, трэба ўгрунтаваць тэзіс аб капіталістычнай стабілізацыі і няўхільнасьць масавага беспрацоўя ва ўмовах капіталістычнае гаспадаркі.

Адыход рабочых мас ад уплыву сацыял-фашызму і рэфармізму, На прыкладах масавых выступленьняў пралетарыяту ў Нямеччыне, Польшчы, ПАЗШ, Індыі, барыкадных баёў у Гамбургу, баявых дэманстрацый у Лодзі і апошніх паведамленьняў друку аб рэвалюцыйных выступленьнях зарубежнага пралетарыяту трэба ахарактарызаваць цяперашні ўздым рэвалюцыйнай хвалі, якая ідзе пад кіраўніцтвам Камуністычнага Інтэрнацыяналу.

Вялікае значэньне сацыялістычнага будаўніцтва СССР для ажыцьцяўленьня ідэй Камуны ва ўсім сьвеце. Бурны рост індустрыялізацыі, нябывалы рух калгаснага будаўніцтва і рост сацыялістычнага сэктару на вёсцы, рашучае наступленьне на капіталістычныя элементы вёскі, а ў раёнах суцэльнай калектывізацыі — поўная ліквідацыя кулацтва, як клясы,—усё гэта мае вялікі рэвалюцыйны ўплыў на міжнародны пралетарыят прапоўнае сялянства і прыгнечаныя народы Усходу, аб чым сьведчаць масавыя выступленьні, дэманстрацыі, мітынгі зарубежнага пралетарыяту (Бэрлін, Лодзь, Варшава, Прага, Лёндан і інш.) над лёзунгамі: «За абарону СССР—бацькаўшчыны пралетарыяту». «Дапаможам ажыцьцяўленьню пяцігадовага пляну СССР».

Вялікі размах і посьпехі сацыялістычнай рэканструкцыі СССР у процівагу сусьветнаму эканамічнаму крызісу капіталізму выклікаюць шалёную злосьць у імпэрыялістых. Адсюль, узмацненьне цкаваньня СССР у капіталістычных краінах, адсюль «крыжовыя паходы» супроць «рэлігійных праследаваньняў» у СССР.

На ўзрастаючы рэвалюцыйны рух у капіталістычных краінах і калёных буржуазіі адказвае белы тэрорам як асноўнай зброяй буржуазіі ў барацьбе з рэвалюцыйнымі элементамі.

У гэтых адносінах сучасная буржуазія ідзе на сьлядох ката Парыскай Камуны крывавага Т'ера. Наступныя даныя пацьвярджаюць гэтае палажэньне: за 1925—29 гады (ня лічачы Кітаю) пасаджана ў турмы рэвалюцыянэраў у капіталістычных краінах—409.069 чал., за 9 месяцаў 1929 году—забіта і пакарана сьмерцю 89.053 чал.

Масавая фізычная расправа буржуазіі з рэвалюцыйнымі элементамі ставіць перад рабочай клясай важнейшую палітычную задачу—аказаньне матар'яльнай і маральнай дапамогі барацьбітом рэвалюцыі. У сьвятле гэтых задач набывае вялікае значэньне МОПР, як баявая арганізацыя інтэрнацыянальнай клясавай салідарнасьці пралетарыяту

Некаторыя фактычныя даныя аб дзейнасьці МОПР'у за 7 год. У СССР колькасьць членаў—3.652.734, лік ячэек —52.000; аказана дапамога палітзьняволеным і іх сем'ям—5.549.370 руб.; аказана дапамога палітэмігрантам, якія прыбылі з капіталістычных краёў у СССР—1.485.426 руб.; прыбыла палітэмігрантаў у СССР—10.464; адпраўлена лістоў палітзьняволеным паршэфных турмаў у капіталістычных краінах—10.627; атрымана ад палітзьняволеных у адказ — 1.146. У капіталістычных краінах: лік членаў МОПР'у — 3.625.147; індывідуальных — 419.874, калектыўных — 3.205.273; матар'яльная і юрыдычная дапамога, аказаная гэтымі сэкцыямі абвярах белага тэрору і буржуазнай юстыцыі—4.455 даляр.; сэкцыі МОПР ва рубяжом—48, з іх легальных—24, нелегальных—24.

МОПР спрыяе шырокаму азнаямленьню працоўных мас з клясавай барацьбой і рэвалюцыйным рухам.

Вялікая роля МОПР'у ў справе кабілізацыі мас да актыўнага ўдзелу ва ўсіх мерапрыемствах дзяржавы па сацыялістычным і культурным будаўніцтве краіны.

АДДЗЕЛ МАСАВЫХ КАМПАНІЙ ЦК КП(б)Б.

ТЭРЧАСЬЦІ І КАЛГАСНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Бурны рост калгаснага будаўніцтва ў Беларусі ў самай недалёкай будучыні зусім зьменіць сацыяльна-палітычны твар нашых часьцей, і ў асаблівасьці тэрытарыяльных часьцей. Намечаныя раёны суцэльнай калектывізацыі ў асноўным супадаюць з раёнамі камплек таваньня тэрчасьцей.

Гэтае шырокае па сваім размаху і важнае па сваіх сацыялістычных задачах мерапрыемства ўжо да надыходзячых абораў чырвонаармейцаў першага году службы і агульнага збору пераменнага складу дае значнае павышэньне процанту калгасьнікаў.

Тэрчасьці ня могуць стаяць у баку ад гэтага магутнага сацыялістычнага руху. Ужо зараз тэрытарыяльныя часьці павінны перабудаваць сваю палітычную работу ў справе паскарэньня калгаснага будаўніцтва ў раёнах камплектаваньня тэрчасьцей. Асноўнай мэтай тэрчасьцей, павінна стаць ня толькі ўцягненьне Чырвонаармейцаў пераменнага складу ў калгасы. Трэба, каб чырвонаармеец - пераменьнік зьявіўся агітатарам і арганізатарам па ўцягненьні ў калгасы бядняцкай і сераняцкай часткі рэшты насельніцтва вёскі.

Асноўнай задачай тэрчасьцей у бягучы пэрыяд павінна стаць значнае паскарэньне тэмпу работы па калгасным будаўніцтве. У радзе часьцей адзначаецца некаторае хістаньне, перашучасьць у прыняцьці тэмпу работ і разьмеражуцяненьня пераменьнікаў у калгасы. Партарганізацыі павінны абвясьціць бязьлітасную барацьбу усякай нерашучасьці, усякім хістаньням у гэтай галіне.

Актыўнасьць пераменнага складу ў справе перабудаваньня вёскі па сацыялістычны лад надзвычай высокая, і тэрчасьці разам з мясцовымі арганізацыямі павінны гэту актыўнасьць ва што-б там ні стала арганізацыйна ахапіць і накіраваць у рэчышча калгаснага будаўніцтва. У раёнах суцэльнай калектывізацыі і ў рэшце раёнаў палітапарат і партарганізацыі часьцей павінны ставіць сваёй задачай уцягненьне ўсяго складу пераменьнікаў у калгасы на працягу 1930 году.

У рабоце па калектывізацыі гаспадарак пераменнага складу трэба шырока ўжываць метад сацыялістычнага спаборніцтва паміж часьцямі і падразьдзяленьнямі.

У сучасны момант тэрчасьці ўжо маюць рад калгасаў, якія складаюцца з пераменьнікаў, але гэтыя калгасы карлікавага тыпу. Палітапарат і партарганізацыі павінны зьмяніць сваю работу ў напрамку будаўніцтва буйных калгасаў і нават на тые камун. Зусім правільным мерапрыемствам будзе, калі, дапусьцім, полк, праводзячы калектывізацыю гаспадарак пераменьнікаў па ўсім раёне камплектаваньня палка, вылучыць у сабе раён камплектаваньня батальёну, як раён пагаловунага ўцягненьня гэтага батальёну ў калгасы.

Работа па калгасным будаўніцтве ні ў якім выпадку не павінна аслабіць ваенна-палітычнай работы сярод пераменьнікаў у пэрыяд паміж зборамі. Наадварот, работа па калектывізацыі мэркуе ўзмацненьне ваенна-палітычнай работы. Перш за ўсё, пераменьніку трэба раскажаць, што калектывізацыя сельскае гаспадаркі ўмацненне абароназдольнасьць СССР, а калектывізацыя гаспадарак пераменьнікаў узьнімае баявую гатоўнасьць і баяздольнасьць яго часьці.

У існуючых і арганізуемых калгасах трэба ўзмацніць ваенна-палітычную работу, арганізаваць моцныя першапачатковыя ячэйкі ваеннай работы—вайсковыя куткі, ячэйкі Асоавіяхіму, самастойныя гурткі вайсковых ведаў, а ў буйных калгасах трэба арганізаваць нават стрэльбішчы і ціры.

Для выкананьня гэтай вялізнай [illegible] і ўзмацненьня [illegible] работы палітапарат і партарганізацыі тэрчасьцей павінны самым шырокім чынам быць інфармаваны аб палітычных настроях і стане работы на раёне з тым, каб быць падрыхтаванымі да работы з пераменным складам на аборах.

На падставе таго, як пасьпяхова справяцца тэрчасьці з гэтымі задачамі, можна будзе судзіць аб узроўні партыйнай і палітычнай работы, аб гатоўнасьці і здольнасьці палітапарату тэрчасьцей выканаць вялікія задачы сацыялістычнага будаўніцтва.

Гіркеа.

Апартунізм у практыцы судовага апарату Гомельшчыны

Матар'ялы праверкі судова-сьледчых органаў Гомельскае акругі. праведзенай камісіяй ЦКК-РСІ Беларусі з удзелам работнікаў НКЮ з поўнай відавочнасьцю паказваюць як, з прычыны нявыразнага партыйнага кіраўніцтва, праходзяць міма апошняга права-апартуністычныя скажэньні ў судовым апараце. Махровыя ўзоры апартунізму ў рабоце гомельскіх судова-сьледчых органаў, скажэньні клясавай лініі ў судзе да прысяду камісіі ЦКК-РСІ засталіся «ня выяўленымі». Больш таго. Гомельская АКК на адным з пленумаў ухваліла па дакладу пракуратуры апартуністычную рэзалюцыю, ні слова не сказала аб барацьбе са скажэньнямі лініі партыі ў судовых органах аб задачах суду на ўмовах абвастраньня клясавай барацьбы, за мяніўцы канкрэтныя дырэктывы ў гэтым напрамку толькі паказаньнем на неабходнасьць захаваньня «прававых норм сялянства» (усяго сялянства! у тым ліку і кулацтва?).

Нагляд за судамі з боку пракуратуры быў настолькі слабы што ў абсьледаваных раёнах выяўлены сотні прыгавораў, якія не адпавядаюць дырэктывам партыі аб наступленьні супроць кулака, ЦКК-РСІ не ўстанавіла ні аднаго выпадку апратэставаньня гэтых прыгавораў. Пленум акрсуду ня даў выразнай установкі судом аб узмацненьні барацьбы з капіталістычнымі элементамі, адкінуў прапанову пракуратуры аб прыцягненьні да адказнасьці судзьдзяў Чачэрскага і Брагінскага раёнаў, якія выносілі сыстэматычныя прыгаворы якія патуралі кулаком-злыднарам. Пленум суду прыняў апартуністычную пастанову, заявіўшы, не саромячыся: «Лічыць нямэтагодным прыцягненьне да адказнасьці, паколькі гэтыя зьявішчы наглядаюцца ва ўсіх судох».

Гэту пастанову нельга інакш разглядаць, як просты выпад супроць лініі партыі. Ім фактычна акрсуд заахвоціў суды на далейшую кулацкую лінію ў сваёй рабоце.

Апрача ўзбуджэньня крымінальных спраў і ўжываньня рэпрэсіі за самакрытыку, у выглядзе палтасаваных яўных (справы рабкораў Мяжэньнікава і Маркава), суды на мясцох шырока ўжывалі прыцягненьне да адказнасьці за самакрытыку пад сьцягам паклёпу.

Выбарачным парадкам выяўлена 17 спраў кулакоў і гандляроў, па якіх вынесены недапушчальна мяккія прыгаворы.

Акруговы суд сыстэматычна зьмяншаў разьмеры штрафу, наложанага судамі на кулакоў і гандляроў бяз усякіх падстаў (такіх спраў выяўлена звыш 40 за год). Такая-ж лінія праводзілася па асобных крымінальных справах. Пон, які нейкім чынам прайшоў у старшыні рэвізійнай камісіі агітатрывалага будаўніцтва, за растрату сродкаў арцелі нават ня быў прыцягнуты да адказнасьці (справа спынена сьледчым). Надзвычайна слабы прыгавор вынесены ў адносінах растратчыка [illegible] сумы старшыні сельсавету, ня гледзячы на тое. што ён меў сувязь з кулакамі і пабудаваў сабе дом коштам у 6 тыс. руб.

У той-жа час абарона батрацтва, барацьба з эксплёатацыяй яго кулакамі і з парушэньнямі працоўнага заканадаўства—судамі ажыцьцяўлялася нядбайна, в у паасобных выпадках у інтарэсах наймальнікаў.

Суд ні ў якай ступені ня быў прыцягнуты да барацьбы з бюракратызмам. «Дырэктывы партыі аб рашучай барацьбе з бюракратызмам ня толькі не знайшлі свайго адлюстраваньня ў судовых органах, але псаўраот, паасобныя справы гэтай катэгорыі замазваліся і канчаліся нічым»—такі сумны для гомельскіх органаў вывад камісіі. Выяўлены выключна вядомыя факты, калі справа аб злачынай цяганіне установленай сьледствам спынялася «на нямэтагоднасьці». Апраўданьне бюракратызму, са батаж дырэктыў партыі—такава і тут лінія некаторых судоў Гомельшчыны. Да злачынстваў службовых асоб суды праўлялі вялікае «спачуваньне» Бясчынствы, гвалты, нават спраны аб хабары ў паасобных вып

РАМОНТ АРФЫ Ў ЯЎРЭЯСКІМ КАЛГАСЕ «ГАРАПАШНІК» (МЕНСКАЯ АКРУГА)

БЕЗ ПРАЕКТАЎ І ПЛЯНАЎ

БУДАЎНІЦТВА ПА АГРАМАДЖАНЫМ СЭКТАРЫ ВЁСКІ У ГЭТЫМ СЭЗОНЕ ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ

У нашым друку і на розных пасяджэньнях часта адзначалася трывожнае становішча з падрыхтоўкай да будаўнічага сезону ў аграмаджаным сэктары сельскае гаспадаркі. Аднак, гэтае становішча ніколькі ня турбуе многіх адказных працаўнікоў Наркамзему.

Зараз адсутнічаюць праекты амаль па ўсіх буйных аб'ектах будаўніцтва НКЗ. Для ілюстрацыі прывядзем даныя, якія паступілі ў камітэт будаўніцтва пры ЭКАНА БССР.

Па **Белсельтрэсьце** адсутнічаюць праекты на пабудову трох маслясыравярных мэханізаваных заводаў у саўгасах Мар'іна, Добрына і Адаменкі; чатырох немэханізаваных заводаў у саўгасах, на малочныя, колькасьць якіх і месца пабудовы дагэтуль ня вызначаны (мяркуюць пабудаваць 10); на вапнавыя млыны, лік якіх і месца пабудовы дагэтуль невядомы; на электрастанцыі ва Ўнаравічах і ў Грозаве.

Па **Калгасазюзе** няма праектаў на 3 электрастанцыі, 8 падстанцый і 3 млыны.

Па **Паляводсаюзе** адсутнічаюць пляны і праекты пабудовы ільна-апрацоўчага заводу ў Воршы, 3 буйных млыноў, 1 крухмальнага заводу на 160 тон і 20 раённых складаў.

Па **Садсаюзе**—на 4 склепы для засолкі гуркоў, на 4 пункты гародняга насеньнядства і на 1 віна-ягадны завод у Гарадцы.

Па **Малочна-жывёлагадоўчым саюзе**—на 4 мэханізаваныя заводы ў Віцебскай, Аршанскай, Бабруйскай і Магілёўскай акругах, на 3 цэнтральныя малочныя—у Віцебску, Гомелі і Магілеве.

На ўсе адзначаныя аб'екты асигнавана звыш 6 млн. рублёў, прычым скарыстаньне гэтых грошай знаходзіцца пад вялікім сумненьнем. Наркамзем і яго органы прысылаюць у камітэт будаўніцтва весткі аб тым, што праекты на тыя ці іншыя аб'екты ўжо складзены, на справе іх або зусім няма, або толькі пачынаюць іх складваць.

Паводле вестак Паляводсаюзу, прысланых у камітэт будаўніцтва, аб'екты індустрыяльнага будаўніцтва па Паляводсаюзе забясьпечаны праектамі: аднак, на пасяджэньні Земляну пры Наркамземе выявілася, што будаўніцтва забясьпечана толькі адным эскізным праектам.

Трэба яшчэ адзначыць, што ў апараце Наркамзему ў галіне будаўніцтва пануе блытаніна, паперовая цяганіна. Камітэт будаўніцтва пры ЭКАНА атрымаў ад Наркамзему і Белсельтрэсту 12 варыянтаў падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону з розным зьменамі і далаткамі, ня лічачы вестак асобных зьвеньняў Наркамзему. Наогул, у будаўнічы камітэт дасланы весткі аб аб'ектах будаўніцтва на 67 аркушох, а канчатковага сьпісу аб'ектаў будаўніцтва яшчэ няма, і цяжка сказаць, калі ён будзе атрыманы.

Нядбайнасьць у падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону, у сувязі з чым дапушчаны ўсе тэрміны, вызначаныя ЭКАНА БССР, пацьвярджаюцца яшчэ і тым, што нават заяўка Наркамзему на цэмэнт трапіла ў Маскву не па адрасе. Паколькі гэта ня было своячасова заўважана працаўнікамі Наркамзему, пацярпела забясьпечаньне будаўнічымі матар'ялямі аграмаджанага сэктару вёскі.

Акрамя таго ў Наркамземе ёсьць бясспрытульная будаўніцтва. Тры крухмальныя заводы, будаўніцтва якіх пачалося калгасамі яшчэ два гады назад, дагэтуль засталіся нясконча́нымі, і далейшы лёс гэтых пабудоў невядомы самому Наркамзему.

Адсутнасьць плянаў і праграм будаўніцтва, адсутнасьць праектаў на аб'екты будаўніцтва, невызначэньне месц пабудоў—гаворыць аб катастрафічным становішчы аб зрыве будаўнічага сэзону па ўсім аграмаджаным сэктары вёскі.

Неабходна НК-РСІ зараз умяшацца ў гэту справу і зрабіць адпаведныя вывады.

Пажадана, каб спэцыялістыя Наркамзему выказаліся ва стаўпках газэты аб прычынах, якія перашкаджаюць будаўніцтву.

М. Шырка.

Агляд грамадзкага харчаваньня

Пад кантроль мас

З 15-га сакавіка пачаўся ўсесаюзны агляд грамадзкага харчаваньня.

Асноўнымі задачамі агляду зьяўляюцца: масавае рабочае абсьледаваньне пастаноўкі і справы ўсяе сеткі грамадзкага харчаваньня з мэтай выяўленьня ўсіх недахопаў і замены іх карэннай перабудовай як самой сыстэмы, так і самога грамадзкага харчаваньня. Арганізаванае наступленьне за стварэньне новых форм грамадзкага харчаваньня, за ўдасканаленьне іх на прадпрыемствах, фабрыках, заводах, жактах, саўгасах, калгасах і г. д.

Добра пастаўленае грамадзкае харчаваньне, як асноўны від рабочага харчавага забясьпечэньня, павышае рэальную зарплату рабочых, адсюль — посьпехі ў барацьбе за прамфінплян, некаторым чынам, залежаць ад посьпехаў паляпшэньня грамадзкага харчаваньня.

«ЗЬВЯЗДА» ПАЧЫНАЕ АГЛЯД РАЗАМ З ЦСПСБ І КІРУЮЧЫМІ УСТАНОВАМІ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ БЕЛАРУСІ. ЦСПСБ ужо разаслаў дырэктыву ўсім АПБ, у якой канкрэтна зазначаны мерапрыемствы прафэрганізацыі агляду на мясцох.

Акруговыя газэты, мабілізуючы ўвагу рабкораў, рэдкалегій насьценгазэт прадпрыемстваў, павінны безадкладна ўключыцца ў аглядавую работу.

На ўсіх прадпрыемствах, заводах і фабрыках арганізуюцца аглядавыя камісіі, задача якіх — згрупаваць наўкола сябе так званы АГЛЯДАВЫ АКТЫЎ, наторы ў выглядзе трэек і рабочых брыгад прыступіць да практычнага агляду ўсіх відаў грамадзкага харчаваньня на прадпрыемстве.

Установы, якія кіруюць грамадзкім харчаваньнем (Белрабсэкцыя, ЦРК, Белкаапсаюз, Калгасцэнтр, Белпылсаюз, Нархарч і інш.), ніякім чынам не павінны адхіляцца ад свайго ўдзелу ў арганізацыі і разгортваньні агляду. Наадварот, УСЕ СВАЕ ПРАКТЫЧНЫЯ ПЛЯНЫ ПА ПАЛЯПШЭНЬНІ ПАСТАНОЎКІ СПРАВЫ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ ЯНЫ ПАВІННЫ ВЫНЕСЬЦІ ПАД КАНТРОЛЬ МАС. Кожны спажывец, кожны работнік народнага харчаваньня, кожны актывісты агляду павінен прымаць актыўны ўдзел у справе паляпшэньня грамадзкага харчаваньня.

Агляд можа мець практычны посьпех толькі пры ўмове, калі ён ад канцылярыі плянуючай установы дойдзе да кожнай асобнай заводскай, жактаўскай, калгаскай сталоўкі.

Парт'ячэйкі, фабзаўкомы, рэдкалегіі насьценгазэт павінны шырока разгарнуць растлумачальную работу аб значэньні агляду, арганізаваць наўкола сябе актыў і вызначыць практычныя мерапрыемствы рэгулярнай сыстэматычнай работы.

Трэба павінна штодзенна асьвятляць ход агляду па двух напрамках: растлумачэньня значэньня грамадзкага харчаваньня, укараненьня яго ў быт кожнага рабочага і служачага, адшуканьня новых яго форм і, з другога боку, — безлітосна бічаваць усе яго недахопы. Асноўна агляду — дасіцца выкратных паляпшэньняў. Ні гутаркі, ні агульныя размовы, а канкрэтнае паляпшэньне ўсёй сыстэмы грамадзкага харчаваньня.

Лесазагатоўкі

Загатоўлены лес падвезьці да пунктаў сплаву

Зараз-жа заняцца вярбоўкай плытагонаў

Мазыршчына не падрыхтавана да сплаву

Зараз наступіў перыяд, калі ўвага савецкай грамадзкасьці на фронце лесазагатовак павінна быць сканцэнтравана на падрыхтоўцы да сплаву лесу.

Павольнасьць, несвачасовае забясьпячэньне сплаву рабсілай, прадуктамі харчаваньня прыладамі можа выклікаць зрыў плянаў. Між тым, праграма сплаву ў гэтым годзе значна павялічана. Намечана сплавіць 2.800.000 куба-мэтраў будаўнічых матар'ялаў і 700.000 кубамэтраў дроў.

Для таго, каб справіцца з гэтым заданьнем, трэба мабілізаваць 30.000 вязкаў і 70.000 плытагонаў. Мабілізацыя гэтай значнай масы бязумоўна сустрэне рад цяжкасьцей тым больш, што ў гэтым годзе значная колькасьць сэзоннікаў - плытагонаў занята ў калгасах.

Трэба ў усёй вострасьцю і рашучасьцю паставіць пытаньне аб наборы рабочай сілы для сплаву, каб уніцкуць прарыву на гэтым важнейшым вучастку фронту лесазагатовак.

Як ідзе падрыхтоўка да сплаву на мясцох? Брыгада Віцебскай школы сплаву абсьледавала становішча ў Мазырскім лесараёне. Брыгада канстатуе, што падрыхтоўка да сплаву, як аддзяленьнем Лесбелу, так і вучасткамі зусім не разгорнута. Працаўнікі Лесбелу лічаць, што яшчэ рана займацца гэтай справай. Не выпрацаваны план правядзеньня сплаву; ня зроблены заяўкі на такелаж; не заключаны ўмовы з спажывецкімі таварыствамі адносна забясьпячэньня сплаву прадуктамі і з лекавымі ўстановамі наконт адкрыцьця часовых мэдпунктаў. Не выпрацаваны расцэнкі на сплаўныя работы.

Дырэктар Мазырскага аддзяленьня Лесбелу тав. Капароўскі заявіў брыгадзе:

«Усё гэта глупства. Галоўнае — вывезьці лес, а сплавіць — заўсёды сплавім, ды і наогул я аб гэтым мала ведаю. Запытайцеся ў майго намесьніка». Калі запыталіся ў намесьніка тав. Кагана — быў такі-ж адказ.

Брыгада адзначыла, што падрыхтоўка да сплаву зрываецца з прычыны недахопу кваліфікаваных работнікаў і няўменьня існуючага штату адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу працаваць пановаму, пераключыць работу на баявы лад.

Брыгада Віцебскай школы сплаву адзначыла, што па Мазырскай акрузе плян сплаву знаходзіцца пад самай сур'ёзнай пагрозай.

Ж. Б.

НА БАРАЦЬБУ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

ЧАМУ АДСТАЕ ЗАВОД „ЭНЭРГІЯ“

Няма кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарнымі брыгадамі

Заўком не перабудаваў свае работы па новых формах і мэтадах

У «Зьвязьдзе» паведамлялася ўжо аб катастрафічным росьце прагулаў па нягрунтоўных прычынах на заводзе «Энэргія». Падрабязнае азнаямленьне з работай заводу дае ўсе падставы, каб зрабіць яшчэ больш рэзкія вывады.

Вельмі характэрна, што найбольшая колькасьць прагулаў прыпадае якраз на студзень месяц, калі на заводзе наглядаўся вялікі ўздым энтузіязму ўсяго рабочага калектыву. У ленінскія дні чатыры цэхі цалкам падалі калектыўныя заявы аб жаданьні ўступіць у ленінскую партыю. Увесь завод быў абвешчаны ўдарным. Агульны сход у 800 чал. ва ўхваленай рэзалюцыі даў урачыстае абяцаньне: «Прыкладзем усе нашы сілы і энэргію для выкананьня прамфінпляну і ажыцьцяўленьня пяцігодкі за чатыры гады». Але ўся бяда ў тым, што заводзкія арганізацыі ня здолелі скарыстаць гэтага вялікага ўздыму энтузіязму і накіраваць яго сапраўды на барацьбу з усімі недахопамі на вытворчасьці.

— Каб мы ведалі, што нас будуць так крыць за недавыкананьне прамфінпляну, зразумела, што мы ўсе сілы паклалі - б, каб гэтага прарыву ня было, — так заявіў старшыня вытворчай камісіі т. Гарачун. Тое-ж гаворыць і сакратар заўкому.

Такім чынам, толькі боязьнь крытыкі магла-б прымусіць гэтых кіраўнікоў павярнуцца тварам да вытворчасьці. А паколькі яны крытыкі не чакалі, яны нічога і не рабілі.

Што можна сказаць аб такім заўкоме і вытворчай камісіі, якія ня ведаюць, хто дае сацспаборніцтва, якія дасягненьні маюць ударныя брыгады? Бачыце, адміністрацыя ніколі не інфармавала заўком аб ходзе сацспаборніцтва, таму заўком аб гэтым і ня ведае. Як быццам кіраваць сацспаборніцтвам павінна ня вытворчая камісія пад кіраўніцтвам заўкому, а адміністрацыя. Зразумела, што, паколькі ні заўком, ні вытворчая камісія ня ведаюць аб выніках сацспаборніцтва, ня ведаюць аб іх і рабочыя заводу.

Толькі пасьля заметкі ў «Зьвязьдзе» аб прарыве ў выкананьні прамфінпляну на заводзе вывешваць весткі аб ходзе сацспаборніцтва і выкананьні прамфінпляну па цэхах. Але і гэтых вестак рабочыя ня чытаюць, бо яны напісаны на бухгальтарскай мове.

З 1.018 рабочых ва ўдарных брыгадах, паводле вестак заўкому, лічыцца 400 чал. Але гэта лічба заўкому некалькі раздута. Заўком лічыць ударнікамі і тых рабочых, якія зьяўляюцца ўдарнікамі толькі на паперы, а фактычна працуюць пастарому. У аформленых брыгадах лічыцца ўсяго 135 чал.

А што робіцца ў цэхах? У ліцейным цэху мелі месца факты рвацтва. Асобныя рабочыя прыходзяць у п'яным выглядзе. Ёсьць выпадкі п'янства і на самім заводзе. У такарным цэху рабочыя часта чакаюць па 1—2 гадзіны, пакуль майстар зноўдзе для іх работу. Ёсьць выпадкі, калі токары шукаюць па дварэ матар'ялаў цэлымі днямі. З прычыны дрэннага забясьпячэньня дапаможнымі матар'ялямі наглядаюцца сыстэматычныя прастоі.

За 5-10 мінут да абедзенага перапынку рабочыя ўжо стаяць у чарзе за абедамі. Гудок прагудзе, а частка рабочых яшчэ абедае. Заўкому-ж гэта не датычыць.

На запытаньне—ці вядзецца сярод рабочых якая-небудзь растлумачальная работа аб прамфінпляне і сацспаборніцтве, сакратар заўкому адказвае:

— А як-жа, культкамісія ставіць канцэрты і кіно (?!).

Ёсьць на заводзе і шмат рабочых, якія толькі нядаўна пакінулі вёску і глядзяць яшчэ на вытворчасьць, як на чужую справу. А культурна-выхаваўчая работа з гэтымі рабочымі ніякай не вядзецца. Больш таго, заўком нават не вядзе падліку гэтых рабочых і кажа, што гэта — справа адміністрацыі (?).

На запытаньне—ці ведаеце вы аб новых формах і мэтадах прафработы, члены заўкому адказваюць: «А чорт іх ведае».

Усе гэтыя факты сьведчыць аб тым, што заводзкія арганізацыі не павярнуліся яшчэ тварам да вытворчасьці, не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з неабходнасьцю выканаць і перавыканаць прамфінплян.

Зараз, калі на заводзе ідзе падрыхтоўка да перавыбараў заўкому, рабочаму калектыву, які ў ленінскія дні паказаў узор сьвядомых адносін да сваіх задач і ўрачыста абяцаў выканаць і перавыканаць прамфінплян, трэба ня толькі паказаць старому складу заўкому на яго буйныя памылкі ў рабоце, але і выбраць такі заўком, які здолеў-бы накіраваць энтузіязм рабочых на ажыцьцяўленьне задач, якія стаяць перад рабочай клясай.

А. МАНЬКОЎ.

НІ АДНАГО ПРАГУЛУ

„Энэргія“, бяры прыклад з „Рухавіка Рэвалюцыі“

МЭТАЛЯТРЭСТ, ХУТЧЭЙ ВЫРАШЫ ЛЁС ЗАВОДУ

За першыя 5 месяцаў бягучага гаспадарчага году гомельскі завод «Рухавік Рэвалюцыі» мае рад дасягненьняў. Вытворчую праграму за першыя 5 месяцаў завод выканаў на 101 проц. Прапановы рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу далі эканомію за 4 месяцы 1.400 руб. І, калі-б заводакіраўніцтва рэалізавала ўсю рэшту прапаноў, вынікі былі-б яшчэ лепшыя.

Добраахвотнае зьніжэньне расцэнак ударнымі брыгадамі дало 541 руб. эканоміі. Ня гледзячы на гэта, заработак рабочых павялічыўся.

На ўдарным заводзе недапушчальны прагулы і спазьненьні. Рабочыя «Рухавіка Рэвалюцыі» зусім апраўдваюць ганаровае імя ўдарнікаў. Калі ў кастрычніку было два прагулы па нягрунтоўных прычынах і 38 спазьненьняў, то ў студзені няма ні аднаго прагулу, а спазьненьняў было ўсяго на дзьве гадзіны.

Зьніжэньне сабекошту ў параўнаньні з планам адстае ўсяго толькі на 0,9 проц. Але заводзкія арганізацыі лічаць і гэты процант недапушчальным.

У мінулым годзе было шмат скаргаў на дрэнную якасьць прадукцыі. Зараз якасьць прадукцыі значна палепшылася. У асноўнага заказчыка—Палесельсаюзу—ніякіх прэтэнзій да заводу наконт якасьці прадукцыі няма.

Зараз завод рыхтуецца да пераходу на новыя мэтады работы. Машыны для індывідуальнага сэктару сельскай гаспадаркі, якія да гэтага часу вырабляў завод, зараз адкідваюць свой век. Трэба пачаць вырабляць новыя машыны, якія былі-б прыстасаваны да патрэб калгасаў. Але гэта патрабуе пераабсталяваньня заводу. А можа трэба перайсьці працаваць на новы завод—Сельмаш? Ёсьць некалькі варыянтаў далейшай работы заводу.

Мэталятрэсту трэба, як мага хутчэй, вырашыць далейшы лёс заводу, каб можна было зараз-жа пачаць падрыхтоўку, ня зьніжаючы ўзятага тэмпу ў выкананьні вытворчых плянаў.

Б. Зэльманаў.

УДАРНЫЯ БРЫГАДЫ БЕЗ КІРАЎНІЦТВА

ШТО ВЫЯВІЛА ЧКК ГУТЫ ІМЯ ДОМБАЛЯ

Часовая кантрольная камісія гуты імя Домбаля ў Нова-Барысаве праверыла ход сацспаборніцтва і работу ўдарных брыгад. ЧКК выявіла, што кіраўніцтва з боку заўкому ўдарнымі брыгадамі адсутнічала. Заўком правёў невыстарчальную работу аб значэньні сацспаборніцтва. Таму ў шліфавальным цэху № 1 арганізавана ўсяго 9 брыгад, якія ахапляюць 115 чалавек. 56 рабочых гэтага цэху зусім ня прымаюць удзелу ў сацспаборніцтве.

Абавязкі, якія ўзялі на сябе ўдарныя брыгады, як зьніжэньне процанту бою, вышэйшае прагулаў, ушчыльненьне рабочага дня, паляпшэньне якасьці прадукцыі, ліквідацыя прастояў і г. д.— ня выкананы. Асноўная прычына—адсутнасьць належнага кіраўніцтва ўдарнымі брыгадамі.

Ударнікі амаль ня прымаюць удзелу ў вытворчых нарадах. Нават пратаколаў вытворчых нарад нельга знайсьці. Ні адна з ударных брыгад яшчэ не зрабіла справаздачы на пасяджэньні заўкому. Інжынэрна-тэхнічныя работнікі да ўдарных брыгад не прымацаваны.

У прэсавым цэху сацдагавор ня выкананы ні аднэй брыгадай, за выключэньнем брыгады т.т. Кузьміча і Кнімава, якая перавыканала нормы па ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы на 3,5 проц. і па зьніжэньні браку і бою на 38,6 проц. У зьмене Ількевіча за два месяцы было 168 гадзін прастояў. У шліфоўні № 1 за два месяцы было 60 прагулаў па нягрунтоўных прычынах.

Амаль што ва ўсіх ударных брыгадах адсутнічаюць пляны работы.

Такое становішча ставіць прамфінплян пад пагрозу зрыву. Як відаць, гута імя Домбаля яшчэ не перайшла на сапраўды ўдарныя тэмпы работы.

Ф. С.

Гута „Пралетары“ праграму выконвае

За першыя 10 дзён сакавіка гута «ПРАЛЕТАРЫ» (Менск) выканала вытворчую праграму на 102 проц. па вазе і на 104 проц. у грашовым вылічэньні.

Антысераднякцкія скрыўленьні ў радзе выпадкаў—вынік правай практыкі

„Левыя“ перагібы дапамагаюць кулацтву

Узмоцнім барацьбу на два франты

КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ ДЫБАМ

У Студзянецкім сельсавеце (Магілеўшчына) асобныя мясцовыя працаўнікі праводзілі калектывізацыю спосабам голага адміністраваньня. Яны пачалі запалохваць сялян, што хто ня пойдзе ў калгас, той будзе выселен за межы раёну сацыяльнае калектывізацыі. Наогул калектывізацыя ў гэтым сельсавеце набывае ненармальныя формы. Яна праводзіцца зьверху.

На агульных сходах сельсаветчыкі замест растлумачальнай работы пусьцілі сярод сялян рэгістрацыйны ліст і патрабавалі, каб усе сяляне ў асаблівым парадку запісваліся ў калгасы. У калгас за адзін вечар запісалася 180 чал.

Калі паўстала пытаньне аб абагуленьні сродкаў вытворчасьці, то мясцовыя працаўнікі не правялі таксама ніякай растлумачальнай работы. У выніку з 180 чалавек, якія запісаліся ў калгас, толькі 14 абагулілі свае сродкі вытворчасьці.

Кулак выкарыстаў такі мэтад «калектывізацыі» і перацягнуў на свой бок частку Беднаты і серадняцтва.

РВК таксама дапусьціў цэлы рад грубых памылак, асабліва пры стварэньні насеннага фондаў. РВК даў загад браць на вучот у Студзянцы ня толькі насенныя фонды гаспадарак, аб'яднаных у калгасы, але і тых, якія яшчэ заставаліся па-за калгасамі. Студзянецкія сельсаветчыкі, кіруючыся гэтаю няправільнаю дырэктываю, мабілізавалі ўсіх мясцовых настаўнікаў і зараз-жа пашлі па дварох апісваць сялянскую маемасьць. Апісвалі маемасьць усіх, хто ўступіў і хто ня ўступіў у калгасы. Удзельнікі апісваньня запалохвалі сялян, што, хто не дазволіць апісваць сваю маемасьць, таму будзе забаронена малоць у млыне і засяваць поле ў індывідуальным парадку. І ў выніку такое работы. Ніхто з сялян, якія яшчэ ня ўступілі ў калгас, зусім ня рыхтуюцца да сяўбы, вбожжа ня чысьцяцца, інвэнтар не рамантуецца і г. д.

Трэба зараз-жа спыніць такі мэтад работы. Работнік РВК, якія давалі няпрывільныя дырэктывы аб абагуленьні, павінны быць прыцягнуты да адказнасьці. Трэба работу па калектывізацыі ў Студзянецкім сельсавеце паставіць на новыя рэйкі. Паляровую калектывізацыю трэба замяніць упартай работай па сапраўднай калектывізацыі. Трэба зараз-жа спыніць усялякія мэтады адміністраваньня. Неабходна даць рашучы адпор кулацтву, якое выкарыстоўвае асобныя памылкі мясцовых працаўнікоў пры правядзеньні калектывізацыі і вядзе сваю злосную агітацыю супроць калгасаў.

С.

„ГРУПЫ БЕДНАТЫ НАМ НЕПАТРЭБНЫ“

Праваапартуністычная практыка ў Амсьціслаўскім раёне

Ня гледзячы на тое, што Амсьціслаўшчына (Аршаншчына) зьяўляецца раёнам суцальнай калектывізацыі, праца з беднатой пастаўлена там дрэнна. Ва многіх сельсаветах раёну —Старасельскім, Татарчанскім, Пацюптаўскім—да гэтага часу не працуюць групы беднаты. Ня існуе таксама батрацка-бядняцкіх груп і пры калгасах. Як на раённых партыйных сходах, так і ячэйкавых ні разу ня ставілася пытаньне аб распрацоўцы і практычным выкананьні пастаноў партыі наконт арганізацыі батрацка-бядняцкіх груп пры калгасах і працы з імі.

Інтарэсы батракоў і беднаты ў калгасах не заўсёды ўлічваюцца і абараняюцца. Вельмі часта беднота атрымлівае работу ў калгасах у апошнюю чаргу.

Паасобныя партыйныя ячэйкі ня ведаюць нават, з каго павінны складацца батрацка-бядняцкія групы. Асобныя партыйныя работнікі наогул выказваюцца супроць арганізацыі батрацка-бядняцкіх груп пры калгасах, заяўляючы, што зараз у калгасах усе павінны быць роўныя і няма чаго весьці паасобку працу з беднатою. Такіх-жа поглядаў прытрымліваецца і праўленьне амсьціслаўскага раённага спажывецкага таварыства. Тут праўленцы таксама выказваюцца супроць арганізацыі груп беднаты сярод пайшчыкаў на тэй прычыне, што, маў, гэтым групам ня будзе чаго рабіць. Між тым, членамі спажывецкага таварыства зьяўляецца каля 80 чал. кулакоў і пазбаўленых выбарчых правоў. Праўленьне пічога канкрэтнага ня робіць для выключэньня ўсіх іх з ліку пайшчыкаў.

Члены Старасельскай ячэйкі пры перавыбарах сельсавету сходы беднаты абарачалі ў агульна-сялянскія сходы. Пытаньне-ж аб перавыбарах сельсавету спэцыяльна на бядняцкіх сходах не абгаворвалася.

Раённыя партыйныя і савецкія арганізацыі павінны вярбіць рашучы пералом у працы з батрацка-бядняцкімі масамі пры калгасах. Толькі пры такіх умовах можа быць забясьпечана правільнае пралетарскае кіраўніцтва калгасамі.

Н. Ж.

„Левыя“ загібы і прымірэнчыя адносіны да кулака

Віцебшчына мае значныя дасягненьні ў справе калектывізацыі вёскі На сёнешні дзень сацыялістычным сэктарам сельскае гаспадаркі ахоплена больш чым 50 проц. зямельнае плошчы акругі. Зараз акруга вядзе практычную падрыхтоўку да веснавое сяўбы. Рамантуецца інвэнтар, абагульваецца цягавая сіла.

Кулак робіць спробы сарваць падыходзячую сяўбу. Ён вядзе шалёную агітацыю сярод сераднякоў і беднаты за разбор абагуленай рабочай жывёлы, за разбор насеньня. Таму зараз, як ніколі, мае вялікае значэньне арганізацыя беднаты і батрацтва, работа сярод беднаты. Там, дзе беднота добра арганізавана, яна дае належны адпор кулацкай агітацыі, адразу-ж спыняе кулацкія спробы дэзарганізаваць работу калгасаў.

Але рад палітычных памылак, дапушчаных паасобнымі працаўнікамі ў некаторых сельсаветах, дапамагаюць кулаку і яго агітацыі супроць калгасаў. У Бешанковіцкім і Гарадоцкім раёнах, замест правядзеньня падрыхтоўчай работы па арганізацыі калгасаў, замацаваньні ўжо арганізаваных калгасаў, стварэньні бядняцка-батрацкіх груп, некаторыя мясцовыя працаўнікі ўжываюць адміністрацыйны націск.

Няправільна вядзіўся зьезд упоўнаважаных па выбары савету камуны «Новы Шлях». На гэтым зьезьдзе некаторыя дэлегаты выступілі з запытаньнямі, ці ня лепш спачатку арганізаваць сельска-гаспадарчую арцель. На гэтыя запытаньні партыйцы Лядзенка і Пячатнікаў далі вельмі «мудры» адказ:

— Хто ня хоча ў камуну ісьці,—заявілі гэтыя гора-калектывізатары,—таму застаецца—ў 24 гадзіны адсюль выбірацца.

Вось яшчэ адзін прыклад, які сьведчыць, што мясцовыя працаўнікі ўсё яшчэ не зразумелі апошніх дырэктыў партыі аб правядзеньні калектывізацыі. На сходзе партыйцаў і камсамольцаў камуны імя Леніна многія заяўлялі: «Бяз прымусу (?!) жывёлы не абагуліш, іншага спосабу правесьці суцальную калектывізацыю няма».

На гэтым-жа сходзе выявілася, што мясцовыя працаўнікі марудзяць з правядзеньнем у жыцьцё новага статуту аб сельска-гаспадарчай арцелі і нават выказваюцца супроць новага статуту.

— Зусім несвачасова апублікаваны прыкладны статут с.-г. арцелі, для нас лепш ісьці па шляху арганізацыі камун —вось як заяўляюць спрытныя калектывізатары з Гарадоцкага раёну.

Адначасова з прышыбеўскімі мэтадамі калектывізацыі, дакрэтаваньнем калгаснага руху зьверху, некаторыя мясцовыя працаўнікі праяўляюць злачынна прымірэнчыя адносіны да кулака. Па недаглядзе раду сельсаветаў асобным кулаком удалося пралезьці ў калгасы, нават у савецкія ўстановы. Некаторыя з кулакоў да гэтага часу не ападаткаваны індывідуальна і лічацца серадлякамі.

Старшыня Каралеўскага сельсавету Міроненка прыхільна адносіцца да б. буйнога арандатара Межынскага, б. памешчыка Шостака і кулака Янсона. Гэтыя кулакі не ападаткаваны ў індывідуальным парадку. Разам з тым працаўнікі Каралеўскага сельсавету робяць перагібы ў адносінах беднякоў і сераднякоў. Так, абкладзена індывідуальным падаткам бяднячка Серадзёва, была спроба ападаткаваць індывідуальна і бедняка Лебедзева.

У Шумілінскім сельсавеце пралез у калгас кулак Гусакоў, б. арандатар ва зёр, эксплёатаваўшы 6 наёмных рабочых. Старшыня сельсавету Шляхтаў абаранае Гусакова. У Краўцоўскім і Янавіцкім сельсаветах не абкладзены індывідуальным падаткам рад кулакоў, у Межынскім раёне па пасаду страхагента пралез кулак, Калкоў Андрэй, які абкладзены індывідуальным падаткам. На агранамічныя курсы ў Віцебску пралез кулак Сухоцкі Іван з в. Руда, Плісканга сельсавету.

У большасьці з гэтых сельсаветаў работа сярод беднаты вядзецца вельмі слаба. Не ва ўсіх калгасах арганізаваны батрацка-бядняцкія групы.

З прычыны прымірэнчых адносін, кулак у некаторых мясцох зноў падняў галаву і вядзе шалёную агітацыю супроць калгасаў. У асобных мясцох кулакі не абмяжоўваюцца аднэй агітацыяй. Так, у Вайханскім сельсавеце 12 кулакоў прыбеглі ў калгас, забралі канфіскаваную ў іх жывёлу, перагналі яе па кулацкія двары і пасвалі ў калгасе кармушкі. Кулакі падбухторвалі калгасьнікаў разабрать абагуленае насеньне. Але беднота і большая частка сераднякоў не пайшлі на вуду кулака. Калгасьнікі арыштавалі кулакоў і над уласным канвоем даставілі іх у Гарадок.

З усіх вышэйпаданых фактаў мы бачым, што ў асобных мясцох Віцебшчыны барацьба з кулацтвам вядзецца нерашуча, дзе-ні-дзе яшчэ ёсьць прымірэнчыя адносіны да кулацтва. Работа з беднатой пастаўлена слаба.

Б.

ВЫНІКІ ПРЫШЫ БЕЕЎСКІХ МЭТАДАЎ

У Старадарожскім раёне (Бабруйская акруга) пры правядзеньні калектывізацыі былі выпадкі скажэньня лініі партыі.

Так, члены Пасецкага сельсавету замест растлумачальнай работы пры калектывізацыі займаліся голым адміністраваньнем і пагражалі тым сялянам, якія адмаўляліся ўступаць у калгасы. Партыец Дуброўскі тых беднякоў, якія не згажаліся па тых ці іншых пытаньнях з ім, называў кулацкімі падпявалам, а на селяніна Каляду склаў пратакол за тое, што ён выступаў на сходах з запытаньнямі аб калектывізацыі. Праводзячы сходы, гэты самы Дуброўскі часта пагражае сялянству міліцыяй. Ясна, што такія мэтады калектывізацыі даюць і вельмі дрэнныя вынікі: за месяц ня ўступіў у калгас ні адзін селянін.

Наглядаюцца таксама перагібы і пры правядзеньні раскулачваньня. У катэгорыю кулакоў трапіла частка сераднякоў. Сельсавет лічыць, што калі хто з сялян мае добрую хату, не пазычае ў суседзяй хлеба, значыць, ён і кулак.

Няправільна праводзіцца і само раскулачваньне. Былі выпадкі, што частка дробнае маемасьці раскулачанае гаспадаркі падзялялася паміж асобнымі членамі калгасу. Старшыня калгасу «Камунар» Аляксандраў забраў вопратку аднаго раскулачанага кулака сабе. Так паступаў і Дуброўскі. Многія рэчы зусім гінулі.

Усе гэтыя факты сьведчаць нам аб тым, што калектывізацыя і ліквідацыя кулацтва, як клясы, у Пасецкім сельсавеце праводзяцца ня так, як трэба. Старадарожскому райкому партыі і РВК трэба зараз-жа паслаць у сельсавет вытрыманых працаўнікоў, трэба як мага хутчэй выправіць усе дапушчаныя памылкі ў справе калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы.

А. Б.

600 дзён цяганіны

У ліпені 1928 году РКК Плешчаніцкага райрабачкому саюзу сельгаслесрабочых разглядала заяву мацыніста электрастанцыі Амбражэвіча аб невыплаце яму РВК 349 руб. за прапрацаваныя ім звыш нормы 130 дзён (расьлічэньне дошак 78 дзён і 52 выхадныя дні).

Бакі ў РКК прышлі да згоды і пастанавілі: «РВК у тыдзёвы тэрмін зрабіць паллік і аплаціць». На гэтым справа заглухла. Пастанову РКК падшылі, рабачком перавыбралі, а Амбражэвіч грошай не атрымаў.

13-га лістапада таго-ж 1928 году гэта справа паступіла ў Плешчаніцкі нарсуд (21-га вучастку). Здавалася-б, што справа зусім ясная: РКК прэтэнзію Амбражэвіча прызнала законнай. Аднак, праз 5 месяцаў нарсудзьдзя Нісэнбаўм, ня гледзячы на яснасьць справы, знайшоў, што іск нічым не даведзены і здавальненьню не падлягае.

21-га мая ўжо 1929 году касацыйная скарга Амбражэвіча на пастанову плешчаніцкага раёну — тав. Нісэнбаўма зьняць з пасады нарсудзьдзі і забараніць яму працаваць у судовых органах на працягу 2-х год.

2 Нарсудзьдзі 1-га вучастку г. Барысава т. Міхневічу абвясьціць суровую вымову за маруднасьць, нерашучасьць і цяганіну пры разглядзе працоўнай справы Амбражэвіча.

3. Абвясьціць вымову прэзыдыуму Плешчаніцкага РВК за недапушчальныя адносіны да справы т. Амбражэвіча і прапанаваць яму безадкладна прыцягнуць да адказнасьці пенасрэдна вінаватых у гэтай справе працаўнікоў РВК, райкамбінату, з якіх у 2-хтыднёвы тэрмін спагнаць у карысьць Амбражэвіча выдаткі яго на судовай цяганіне ў суме 48 руб. 36 кап.

4. Пастанову бюро сэкцыі РСІ пры Барысаўскім гарсавеце ад 10-га студзеня 1930 году наконт цяганіны на справе Амбражэвіча ў судовых органах скасаваць, як пастанову, якая дакладна не разабрала гэтай справы і фактычна апраўдала бюракратычныя адносіны судовых органаў.

5. Гэту пастанову абвясьціць у друку.

С.

Доўгатэрміновы крэдыт--дзяржаве

Усе нашы пазыкі пашыраюцца пад лёзунгам: «Дзяржаве патрэбен доўгатэрміновы крэдыт». Гэты лёзунг высоўваюць самі рабочыя масы. На кароткатэрміновыя пазыкі нельга будаваць прамысловасьць і праводзіць калектывізацыю сельскай гаспадаркі

За бюджэтную дысцыпліну, супроць рвацтва

Напружанае становішча з кадрамі спецыялістых скарыстана некаторымі ўстановамі і супрацоўнікамі для рвацкіх палітыкаў і беспадстаўнага павялічэньня ставак.

«Налёт» лёгкай кавалерыі выявіў, што некаторыя ўстановы ня прытрымліваюць пастановы Наркампрацы адносна нарміраваньня зарплаты. Так, у ВСНГБ значна павялічаны стаўкі раду спецыялістых бяз усякага дазволу адпаведных органаў. Інжынэр **Розін** у 1928-29 г. атрымліваў 250 руб., зараз — 450 руб.; стаўка інжынэра **Кауфмана** павялічана з 250 да 350 руб., **Савіцкага** — з 200 да 300 руб., **Гіршгорна** — з 200 да 275 руб., **Розэнблата** — з 300 да 400 руб.

У Белсельтрэсьце інжынэр **Сахараў** атрымлівае 500 руб. бяз згоды Наркампрацы, прычым гэтай стаўкі ніхто не заньвярджаў. Галоўбух **Сарагавец** не рэагаваў на гэтае парушэньне бюджэтнае дысцыпліны.

У Белкалгасцэнтры тэхнік **Беленьні** павінен быў атрымліваць 200 руб., атрымлівае 250 руб.

У радзе ўстаноў працуюць так званыя «лішэ-спэцы». Былы інспэктар Наркамфіну **Пэнэрджэ**, зусім не знаёмы з палітыкай партыі на вёсцы (гэта высьветлілася пры чыстцы Наркамфіну), раптам апынуўся ў Белсельснабе «спэцам» па мапына-забесьпячэньні.

У Белкалгасцэнтры працуе інструктарам па фінансаваньні і крэдытаваньні нейкі **Залескі**, які служыў у Наркамфіне, перад чысткай звольніўся і паступіў у Лесбел, дзе яго доўга ня трымалі і зьнялі з работы.

Калгасцэнтр узяў яго, як «спэца», не даведаўшыся аб яго мінулым.

Траба ўстаналіць цьвёрдую фінансавую дысцыпліну ва ўстановах, прыцягваць да адказнасьці галоўбухаў, якія не рэагуюць на парушэньні бюджэтнай дысцыпліны, на няправільнае выдаткаваньне сродкаў.

Органы Наркампрацы пваніны рашуча змагацца з пераманьваньнем спэцыялістых, асабліва тады, калі пераманьваюцца ліпавыя спэцы, накшталт Залескага і Пэнэрджы.

НА РАБСЕЛЬКОРАЎСКІЯ ЗАМЕТКІ РЭАГАВАЦЬ ДАКЛАДНА І СВАЯЧАСОВА

Лёзунг партыі па барацьбе з бюракратызмам, цяганінай, выкарчоўваньнем усяго дрэннага і гнілога з савецкага апарату яшчэ некаторымі работнікамі ўстаноў дакладна ня выконваецца. Гэта можна бачыць з адказаў на рабселькораўскія заметкі, якія рэдакцыяй дасылаюцца на рассьледваньне.

Рабселькораўскія заметкі ў розных установах марынуюцца па некалькі месяцаў, адказы ня маюць яснасьці, а часамі чыста бюракратычныя. Між іншым ёсьць выпадкі замазваньня фактаў. Падамо некалькі прыкладаў:

ВЫРУЧЫЛІ

Селькор пісаў, што сяляне вёскі Лельчыцы, Мазырскай акругі, ад КСУ ня бачаць ніякай дапамогі. Камітэт узаемадапамогі нічога ня робіць. Беднота падпадае пад уплыў кулака і папа. Так, пох Магільніцкі не прапусьціў дрэнная работы КСУ і скарыстаў яе ў асабістых мэтах, ён згрупаваў вакол сябе беднату, выдаваў ім грошы, а за гэта атрымліваў прокаты.

Мазырскі акрінспэктарыят сацыяльнага забесьпячэньня паведамляе, што паказаныя ў заметцы факты адпавядаюць сапраўднасьці. Камітэт узаемадапамогі нічога не рабіў. Прыняты меры да ажыцьцяўленьня работы. Вынесена старшыні ганьбаваньне. Пасьля гэтага старшыня паправіўся, а потым быў выведзены са складу камітэту ўзаемадапамогі. Рапей была думка аддаць яго пад суд, але калі ён увайшоў у калгас, дык пад суд не аддалі.

Вось як бюракратычна падышоў да бяднацкага пытаньня Мазырскі акрінспэктарыят сацыяльнага забесьпячэньня. Старшыня камітэту ўзаемадапамогі натураў кулацтву. У выніку гэтага поп арганізаваў свой «камітэт узаемадапамогі», ён на бяднацкай шыі будаваў сваё жыцьцё, а акруговы інспэктарыят сацыяльнага забесьпячэньня супакоіўся на тым, што старшыня сам пайшоў у калгас і не аддаў яго пад суд. У работнікаў Мазырскага акрінспэктарыяту сабесу калгас абвяшчаўся ў «добраахвотную карную» арганізацыю, а гэта больш дапамагае скрыўленьню клясавай лініі.

РАБАЧКОМ ЗМАЗАЎ

У аддаленьні Чэрвенскага Лесбелу, дзе працуе каля 1.700 чалавек, як пісаў «Свой», дагавор сацпаборніцтва да гэтага часу не заключаны. На вышэйшыя пасады рабачком «вылучыў» п'яніц (Рылейка, Ганчарык, Цыгановіч), якія раней былі засуджаны за забойства, а зараз агітуюць за рвацтва, зрываюць сходы і г. д. Адміністрацыя з гэтымі кандыдатурамі згадзілася.

Чэрвенскі рабачком саюзу сельска-гаспадарчых рабочых паведаміў: «Факты пацьвердзіліся. Сход у Лесбеле адбыўся на якім гэтыя п'яніцы хацелі сарваць яго, за што яны панесьлі адказнасьць. Лясьнічы Грэбенскага лясьніцтва на сходзе гаварыў, што хацеў перадаць тэкст сацдагавору Вузьдзенскаму лясьніцтву па тэлефону, але парваліся правады». Скончана.

Факт пацьвердзіўся, а сацспаборніцтва напэўна чакае, пакуль падладзяць правады (!). Што зроблена адносна «вылучэнцаў», аб якіх нам пісаў рабкор, бюракраты маўчаць.

САКРАТАР БОБРСКАЙ ЯЧЭЙКІ ПЫТАНЬНЕ ЗМАЗАЎ

У заметцы «Беларуская забясьпечана» пісалася, што Бобрскі камітэт узаемадапамогі нічога ня робіць па падрыхтоўцы да акруговай нарады беднаты. Дрэнна таксама і з забесьпячэньнем дрывамі, а яшчэ горш—гэта другі выпадак растраты.

Крупскі райком партыі, якому была паслана заметка на рассьледваньне, у адказ прыслаў адносіну сакратара Бобрскай ячэйкі КП(б)В, які піша: «Справа высьветлена, што ў Бобрскім местачковым КСУ была зроблена растрата ў 1926-1927 годзе яшчэ былым старшынёю КСУ Камаровым. Справа перадана Крымвышуку, якім і быў зроблены допыт».

Такі адказ бязумоўна змазвае сучаснае становішча ў КСУ. Справа ішла ня толькі аб растраце 1926-27 году, але і аб растраце, якую зрабіў КСУ ў 1929-30 годзе.

***

Наогул трэба адзначыць, што некаторыя работнікі ўстаноў несвячасовым рэагаваньнем на заметкі і такімі адказамі яскрава паказваюць на сваю нядольнасьць праводзіць правільную лінію партыі і тым больш натураюць разьбіцю бюракратызму. З гэтым трэба рашуча змагацца.

Ні адна заметка, пасланая на рассьледваньне, не павінна застацца без належнага і свячасовага рэагаваньня. За бюракратычныя адказы трэба прыцягваць да адказнасьці.

Н.

МЕНСК

Прыезд прадстаўніка Выканкому МОПР'у

Для ўдзелу на ўрачыстым вечары, прысьвечаным 59-й гадавіне Парыскай Камуны і дню МОПР'у, сёньня прыяжджае прадстаўнік літоўскай сэкцыі МОПР'у тав. Кер.

Усебеларуская нарада плянавых і статыстычных работнікаў

Сёньня, а 6 гадз. веч., пры Дзяржплане БССР адкрываецца Усебеларуская нарада плянавых і статыстычных органаў. На нарадку дня нарады даклады: аб чарговых задачах плянавых органаў (тав. Гольдбэрг), аб складаньні кантрольных лічбаў на 1930-31 г. (тав. Пятровіч) і аб рэарганізацыі плянавых і статыстычных органаў (тав. Гальдштэйн).

Распушчана праўленьне Мазырскага аддзяленьня АЗЕТ

На аснове вынікаў абсьледваньня інструктарам Белазет Мазырскай арганізацыі АЗЕТ'у—бюро Мазырскага акругкому КП(б)Б распусьціла за бязьдзейнасьць праўленьне Мазырскага аддзяленьня АЗЕТ'у.

За дзень

— МЦРК праводзіць **новы набор у дзіцячую сталоўку.**

На гэтай зьмене абеды будуць выдавацца для 60 дзяцей (раней было на 45 дзяцей). Месцы разьмяркоўваюцца на прадпрыемствах.

***

— ЦСПСБ адкрывае курсы шахматных інструктароў на 40 чал., з якіх 30 —рабочыя прадпрыемстваў.

Усебеларуская міжсаюзная канфэрэнцыя фізкультурнікаў

Учора на ранішнім пасяджэньні міжсаюзнай усебеларускай канфэрэнцыі фізкультурнікаў з дакладам аб становішчы і задачах фізкультурнай работы ў прафсаюзах Беларусі выступіў старшыня бюро фізкультуры пры ЦСПСБ тав. **Клімковіч.**

Дакладчык у сваёй прамове спыніўся на тым пераломе ў фізкультурнай працы, які адбыўся ў зьвязку з пераходам ня на новыя формы.

Трэба было весьці барацьбу з чэмпіёнствам, аналітычнасьцю і замкнутасьцю фізкультурнікаў. Фізкультурныя гурткі павінны былі прыняць актыўны ўдзел ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве. Зараз дасягнуты некаторыя посьпехі. У Магілеве ударнымі брыгадамі ахоплена 750 фізкультурнікаў. Фізкультурнікі - гарбары зьнялі расцэнкі. Бабруйскія фізкультурнікі-ударнікі лічацца ў сваёй працы самымі прыкладнымі. У Магілеве арганізавана 14 брыгад фізкультурнікаў па рамонце с.-г. машын. У Гомелі арганізаваны 23 такія брыгады. Фізкультурнікі прымаюць актыўны ўдзел у правядзеньні пасеўнай кампаніі, ачыстцы насеньня і г. д.

Але побач з гэтым ёсьць рад недахопаў у фізкультурнай працы. Ня ўсе фізкультурнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі. Напрыклад, на заводзе «Чырвоны Кастрычнік» з 40 фізкультурнікаў толькі 22 ударнікі. Слабая работа праводзіцца ў саўгасных фізкультурных гурткох. Ня ўсе гурткі прымаюць актыўны ўдзел у веснавой кампаніі.

Далей тав. Клімковіч ахарактарызаваў рост фізкультурных гурткоў. На 8 фабрыках па Беларусі колькасьць фізкультурнікаў на 1-га лютага павялічылася больш, чым на 24 проц. Па Магілеве лік фізкультурнікаў павялічыўся на 150 чал., у Менску — на 450. Але гэты рост адбываецца толькі за кошт моладзі. Дарослыя рабочыя ў фізкультурную працу ўцягваюцца вельмі слаба. Напрыклад, на фабрыцы «Дняпроўская Мануфактура» працуе 1.000 чал., а фізкультурнікамі толькі 60 чал. Бываюць і недарэчнасьці ў працы фізкультурных гурткоў. Рачыцкі рабочы клюб распусьціў гурток фізкультуры толькі таму, што ён, моў, не дае ніякага прыбытку.

Выступаўшыя ў спрэчках таварышы адзначылі **слабае кіраўніцтва камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый фізкультурнымі гурткамі.** Была зьвернута таксама ўвага на **падрыхтоўку новых кадраў фізкультурных работнікаў.** Дэлегат з Гомэлю тав. **Архіпенка** расказаў на канфэрэнцыі, як брыгада фізкультурнікаў - металістых павысіла прадукцыйнасьць працы ў два разы. Фізкультурныя гурткі выканалі заданьне па ачыстцы насеньня на 700 проц. Дэлегаты Гомельшчыны скардзіліся, што «Полесская Правда» зусім не асьвятляе на сваіх старонках фізкультурнае работы.

Даклад аб міжнародным спартыўным руху зробіць прадстаўнік УсеЦСПС тав. Вягчын.

Мэдычнае абслугоўваньне плытагонаў

НК Аховы здароўя запрапанаваў усім акруговым інспэктарыятам аховы здароўя, а таксама Віцебскаму АВК і гарсавету прыняць больш рашучыя меры да арганізацыі мэдычнага - санітарнага абслугоўваньня рабочых - плытагонаў. У першую чаргу павінна быць зьвернута максымальная ўвага на санітарнае становішча пунктаў адгрузкі і выгрузкі плытоў, дзе заўсёды канцэнтруецца шмат рабочых.

Санітарныя і раённыя дактары на працягу ўсяе сплаўнае кампаніі павінны будуць наведваць гэтыя пункты і сачыць за іх санітарным становішчам. Запрапанавана ўсім лекавым установам БССР рабіць мэдычную дапамогу плытагонам у першую чаргу. Сур'ёзная ўвага будзе зьвернута на шпітэлізацыю цяжка - хворых плытагонаў.

Сёньня, а 8 гадз. увеч. у памяшканьні клюбу саўгандальслужачых, склікаецца **МІТЫНГ - ПЕРАКЛІЧКА** калектываў саюзу саўгандальслужачых па пытаньні аб чысткі апарату.

У парадку дня: 1) Даклад НК-РСІ аб падрыхтоўцы да чысткі апарату (т. Хмялеўскі).

2) Рапарт МК і ГК ЦРК, ВСНГ, Наркамгандлю, Белкаапсаюзу і камісій салеейнічаньня пры гэтых установах, аб ходзеа падрыхтоўчай работы да чысткі апарату.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЕНЬНЯ

Дом Камасьветы. У 19 гадз. у Доме Камасьветы адбудзецца лекцыя т. **Рыўліна** для парт. і камс. актыву на тэму: «Парыская Камуна». Пасьля лекцыі мастацкая частка. Білеты ў РК КП(б)Б, ЛКСМ і чытальні Дому.

Клюб акрвыканкому. У 18 гадз. у клюбе акрвыканкому склікаецца раённы сход усіх дэлегацкіх сходаў Фрунзы заўскага раёну з наступным парадкам дня: Аб становішчы работы дэлегацкіх сходаў, лекцыя журналістага **Гарэліка** аб становішчы жаночы Усходу. Запрашаецца ўвесь жаночы актыў. Яўка дэлегатак абавязкова.

Антырэлігійны унівэрсытэт. Чарговыя заняткі ун-ту адбуд. у 18 гадз. 15 мін. на пэдфаку (фізычная аўдыторыя).

Клюб імя Розы Люксэмбург. Прызначаны на 17 сакавіка вечар, прысьвечаны Парыскай Камуне, перанесіцца на 18-га сакавіка на 19 гадз. 30 мін Білеты, разасланыя на 17 сакавіка, маюць моц і на 18-га. Яўка членаў ячэйкі бязабожнікаў абавязкова.

Вайсковы габінэт БДУ. У 19 гадз. у актавай залі прызначаецца збор сярэдняга і старэйшага кампаліталдыскладу запасу і дабутэрмінова-адпускных студэнтаў БДУ ўсіх факультэтаў і курсаў. Яўка абавязкова.

ЗАЎТРА

БДУ. У 19 гадз. у аўд. 4 прыродазнаўчага корпусу—пасяджэньне асьцыр. пісьм. сэмінару. Даклад тав. **Дудкова** — «Столыпінская рэформа ў Віцеб. губ.».

Клюб нац. працаўнікоў. У 20 гадз. агульны сход мэдычнай сэкцыі Белтарнітса.

— У 21 гадз. пасяджэньне прыймовай камісіі Белтарнітса.

— Пры клюбе стала два разы ў месяц будзе выходзіць фотахроніка СНП. Просьба да ўсіх навуковых працаўнікоў здаваць здымкі, або малюнкі аб некаторых дасягненьнях з жыцьця навуковых працаўнікоў і ўстаноў у канцэлярыю клюбу.

Дэкадны камвуз. Чарговыя заняткі камвузу адбудуцца — на эканамічным цыклі ў 18 гадзін (лектар тав. **Будзінскі**), на гістарычным — у 18 гадз (лектар тав. **Буткевіч**) і на філёзофскім — 19 гадз. (лектар тав. **Вайнштэйн**).

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Цэнтральны Савет Прафэсыянальных Саюзаў Беларусі, Белкалгасцэнтр і Ўсебеларуская рабочая газэта

„РАБОЧИЙ"

З 25 сакавіка г. г. адкрываюць заочную канфэрэнцыю рабочых, пасланых на сталую працу ў калгасы.

ПАРАДАК КАНФЭРЭНЦЫІ:

1. Калгасны рух у сучасны момант і задачы рабочых - калгасьніваў — даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. Васілевіча.
2. Арганізацыя і аплата працы ў калгасах (спрэчкі абагульвае старшыня Калгасцэнтру т. Сьмірноў).
3. Шэфства прафсаюзаў над калгасамі (спрэчкі абагульвае старшыня ЦСПСБ тав. Рыжоў).

Парадак правядзеньня канфэрэнцыі наступны:

У нумары ад 25 сакавіка газэта «Рабочий» зьмяшчае рэдакцыйны артыкул. Потым будуць зьмешчаны даклады і спрэчкі—карэспандэнцыі рабочых па пытаньнях парадку дня.

За два тыдні да скаканьня канфэрэнцыі, усім таварышам, якія знаходзяцца на працы ў калгасах, будуць накіраваны праекты рэзалюцый, якія пасьля ўнясеньня паправак, дадаткаў і зьмён, адсылаюцца зноў у рэдакцыю і друкуюцца ў газэце.

У канфэрэнцыі, акрамя памянёных вышэй арганізацый і асоб, прэзыдыумам ЦСПСБ прапанавана прыняць удзел усім акрпрафбюро, ЦП саюзаў і фабзаўкомам.

Просьба да ўсіх таварышоў, пасланых для сталай працы ў калгасы, паведаміць у рэдакцыю газэты «Рабочий» свой дакладны адрас для высылкі ім газэты.

ПРЭЗЫДЫУМ ЦСПСБ.
БЕЛКАЛГАСЦЭНТР
РЭДАКЦЫЯ ГАЗ. «РАБОЧИЙ.

УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ, ПРЫСЬВЕЧАНАЕ ДНЮ МОПР'у

18 САКАВІКА — БЕЛДЗЯРЖТЭАТР — 18 САКАВІКА

АДБУДЗЕЦЦА

УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ, ПРЫСЬВЕЧАНАЕ 59-Й ГАДАВІНЕ ПАРЫСКАЙ КАМУНЫ І ДНЮ МОПР'у

разам з партыйнымі, прафсаюзнымі, камсамольскімі і чырвонаармейскімі арганізацыямі.

Парадак дня: 1. Даклад аб парыскай камуне і задачы МОПР'у. Дакл. сакратар ЦК КП(б)Б т. ГЕЙ.
2 Прывітаньне прадстаўніка выканкому МОПР'у, ЦК МОПР Бел. і інш. арганізацый.

Пасьля ўрачыстай частні пастаноўка „ЯРАСЬЦЬ".

Пачатак роўна а 7 гадз. увечары. Пасьля 7 гадзін уваход у залю будзе зачынены. Білеты выдаюцца ў райкомах МОПР'у.

Мясцовы Акруговы камітэт МОПР'у

14.000 ПАДПІСЧЫКАЎ на „ЗЬВЯЗДУ" ПА МЕНСКАЙ акрузе на КРАСАВІК м-ц 1930 год.

На сакавік месяц падпіска па акрузе складае 11.000 экз.

РАЙКОМЫ, ПАРТ'ЯЧЭЙКІ і ЎПОЎНАВАЖАНЫЯ!

ЗАРАЗ-ЖА РАЗГАРНЕЦЕ РАБОТУ па вярбоўцы новых кадраў ПАДПІСЧЫКАЎ

Канкрэтнымі, сапраўднымі мерапрыемствамі па пашырэньні „ЗЬВЯЗДЫ" ВЫКАНАЕМ ГЭТУ ЛІЧБУ.

НІ АДНАГО партыйца і беспартыйнага актывістага БЕЗ „ЗЬВЯЗДЫ"

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА — БЕЛКАЛГАСЦЭНТР

Арганізацыя і аплата працы ў калгасах

Стар. 48 ЦАНА 12 к.

УВАГА!

З панядзелка, 17 сакавіка

кіно-тэатр „ІНТЗРНАЦЫЯНАЛ"

ПРАЦУЕ БЕСЬПЕРАПЫННА з 12 гадз. дня.

)—(НА ЭКРАНЕ)—(

2-гі тыдзень пастаноўкі 2-гі

ЗАМЕЖНЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

ЧАЛАВЕК АГНЮ

Рэжысэр Эрых Вашнек.

У галоўных ролях: Вольга Чэхова. Хэдда Томас. Рудольф Рытман. Гэнры Сьцюарт.

САЧЭЦЕ ЗА РАСКЛАДАМ СЭАНСАЎ:

ДЗЕННЫЯ СЭАНСЫ: Пач. 1-га сэансу а 1 г. дня, 2-га а 2 г. 30 м., 3-га а 4 гадз.

Ц Е Н Ы: Ц Е Н Ы: Ц Е Н Ы: